СЯМ'Я
З МОВАЙ
ЛЮБОВІ

Сямейная

НЕБЯСПЕЧНАЯ
ГАДЖЭТАМАНІЯ

Сямейная

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

2 ЛЮТАГА 2023 г. ЧАЦВЕР № 21 (29901)

ЛІЧБА ДНЯ

11,7 млн

склала агульная колькасць абанентаў сотавай рухомай электрасувязі ў краіне на 1 студзеня 2023 года. Сёння ўзровень пранікнення сотавай рухомай электрасувязі ў краіне складае 127,2 абанента на 100 жыхароў. Сотавай рухомай электрасувяззю другога і трэцяга пакаленняў ахоплена 99,3 працэнта і 98,6 працэнта тэрыторыі Беларусі. Акрамя таго, у студзені—снежні 2022 года актыўна развіваліся сетка сотавай рухомай электрасувязі стандарту LTE і паслугі на яе аснове. У эксплуатацыю ўведзена 695 базавых станцый стандарту LTE, што дало магчымасць павялічыць ахоп насельніцтва паслугамі сотавай рухомай электрасувязі дадзенага стандарту да 98 працэнтаў. Развіццё сетак сотавай рухомай электрасувязі трэцяга і чацвёртага пакаленняў забяспечвае стабільны рост колькасці абанентаў бесправаднога шырокапалоснага доступу да сеткі Інтэрнэт.

ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ НОВАГА ПАКАЛЕННЯ

Фота БелТА.

Грант Прэзідэнта на распрацоўку і ўкараненне ў адукацыйны працэс электроннага вучэбна-метадычнага комплексу «Інавацыйныя падыходы і тэхналогіі ў адукацыйным працэсе» на рускай і англійскай мовах для студэнтаў ВНУ атрымала загадчыца кафедры педагогікі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Куляшова Алена Снапкова. Распрацоўка дасць магчымасць павысіць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне педагогікі і псіхалогіі.

На здымку: Алена СНАПКОВА падчас работы над праектам са студэнтамі, прэзідэнцкімі стыпендыятамі Арынай ГАЛАЎНЁВАЙ і Ангелінай ЗЕЛЯНКЕВІЧ.

КАРАТКА

- Выстава «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры» будзе працаваць у Мінску да 3 ліпеня.
- **Нацыянальны атлас Беларусі плануюць перавыдаць да сярэдзіны 2024 года.**
- Беларускія мытнікі канфіскавалі 664 кг наркотыкаў і 1000 боепрыпасаў за 2022 год.
- **У турыстычнай сферы занята каля пяці працэнтаў эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі.**
- ДМК: у 2023 годзе плануецца завяршыць рэканструкцыю аўтадарожнага пункта пропуску «Казловічы».

ISSN 1990 — 763X

Родныя далягляды

АД ПАЛЕСКІХ АФІН ДА БЕЛАРУСКІХ МАЛЬДЫВАЎ

Аўтары турыстычных маршрутаў прапануюць па-новаму зірнуць на сваю спадчыну

У Гродзенскай вобласці падвялі вынікі конкурсу, які праводзілі абласное аб'яднанне прафсаюзаў сумесна з упраўленнем спорту і турызму аблвыканкама. Было разгледжана больш за 40 заявак. Самымі цікавымі прызнаны 11 маршрутаў, галоўнай асаблівасцю якіх з'яўляецца навізна.

СТАР. 4

Лічбавы свет

Для адных — частка сябе, для другіх — тавар

Пра каштоўнасць, абарону і небяспечнае выкарыстанне персанальных даных

Інфармацыйнае асяроддзе захоплівае ўсё больш працэсаў, з'яў і сфер нашага жыцця. Звесткі пра людзей з'яўляюцца каталізатарам многіх паслуг і працэсаў, для збору інфармацыі пра асобу прымяняюцца ўсё больш глыбокія і дасканалыя спосабы, якія часта не з'яўляюцца празрыстымі для грамадзян. Для абароны асабістых звестак у Беларусі дзейнічае адпаведны закон, за парушэнне якога прадугледжана адказнасць ад штрафу да зняволення. Тым не менш практычна штотыднёва фіксуюцца ўцечкі асабістых даных, прычым не толькі ў нашай краіне, але і ў іншых дзяржавах. Таму пытанні, звязаныя з абаронай асабістай інфармацыі, аховай прыватнага жыцця, набываюць усё большую актуальнасць, перакананы спецыялісты, якія расказалі пра перавагі і рызыкі адносін у лічбавым асяроддзі.

СТАР. 3

Візіт у Зімбабвэ завершаны

Завяршыўся дзяржаўны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Зімбабвэ. У аэрапорце згаданай краіны кіраўніка дзяржавы праводзілі гэтак жа ўрачыста, як і сустракалі ў першы дзень візіту, — з ротай ганаровай варты, выкананнем гімнаў ды мясцовым каларытам — танцамі і песнямі, паведамляе БелТА са спасылкай на тэлеграм-канал «Пул Першага».

Учора, у апошні дзень візіту, беларускі лідар разам з Прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагвай наведаў знакаміты вадаспад Вікторыя і кантактны заапарк. «Нястрымная моц воднага патоку параўнальная з сілай народа Зімбабвэ», — такі памятны запіс пакінуў Аляксандр Лукашэнка пасля азнаямлення з адной з галоўных славутасцяў Зімбабвэ.

Потым кіраўнікі абедзвюх дзяржаў правялі перагаворы без прэсы і камер.

Павышэнне БПМ, а з ім дапамог на дзіця і некаторых пенсій

Што змяняецца з 1 лютага

Пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 2023 г. № 1 на перыяд з 1 лютага да 30 красавіка 2023 г. зацверджаны памеры бюджэту пражыткovага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах. Такім чынам, у сярэднім на душу насельніцтва ён устаноўлены ў памеры 341 рубель 48 капеек, што на 0,5% вышэй у параўнанні з нарматывам, які дзейнічаў з 1 лістапада 2022 года да 31 студзеня 2023 года.

Па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах БПМ у цэнах снежня 2022 года ўстаноўлены наступным чынам. Для працаздольнага насельніцтва — 377 рублёў 14 капеек, пенсіянераў — 256 рублёў 70 капеек, дзяцей да трох гадоў — 217 рублёў 39 капеек, ад трох да шасці гадоў — 300 рублёў 03 капейкі, ад шасці да 18 — 365 рублёў 76 капеек.

У сувязі са змяненнем БПМ з 1 лютага 2023 года аўтаматычна пераглядаюцца ўбудаваныя ў сістэму сацыяльнай абароны розныя надбаўкі і павышэнні, а таксама асобныя сацыяльныя выплаты, якія вылічаюцца ад памеру БПМ. Гэта памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей; павышэнні да пенсій, прадугледжаныя для асобных катэгорый пенсіянераў; даплаты і надбаўкі пенсіянерам ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым, што атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне; дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту; сацыяльныя пенсіі.

Усяго пераразлікам будуць ахоплена больш за 700 тысяч атрымальнікаў сацыяльных выплат (дзеці, пажылыя грамадзяне, інваліды).

Такім чынам, з 1 лютага 2023 года да 31 ліпеня 2023 года памеры дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў складуць на першае дзіця — 605,99 рубля, на другога і наступных дзяцей — 692,56 рубля, на дзіця-інваліда — 779,13 рубля. Памеры дапамогі выраслі на 9 працэнтаў.

Нагадаем, што ў адпаведнасці з Законам «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» памеры дапамогі па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў пераразлічваюцца два разы на год: з 1 лютага і 1 жніўня.

Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў складае на першае дзіця — 35 працэнтаў сярэднямесячнай заработнай платы работніка ў краіне за квартал, на другога і наступных дзяцей — 40 працэнтаў, на дзіця-інваліда незалежна ад чарговасці яго нараджэння — 45 працэнтаў.

У сувязі з павышэннем БПМ адназовыя дапамогі пры нараджэнні дзіця складуць 3 414,80 рубля (на першае дзіця), на другога і наступных дзяцей — 4 780,72 рубля. У цэлым расходы на выплату дапамог па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў у 2023 годзе складуць 2 мільярды рублёў.

Вырастуць і мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, іх новыя памеры будуць дзейнічаць да канца красавіка. У прыватнасці, сацыяльныя пенсіі паднялі з 169,92 да 170,74 рубля. Іх атрымліваюць грамадзяне, якія не выпрацавалі належны страхавы стаж і не могуць прэтэндаваць на працоўную пенсію. Пры гэтым з 1 лютага не павышаюць працоўныя пенсіі па ўзросце, за выслугу гадоў, па інваліднасці, па страце кармільца. Апошні раз іх падымалі з 1 снежня 2022 года.

Алена КРАВЕЦ.

На ўзроўні

У ПОШУКУ АДЗІНЫХ ПАДЫХОДАЎ

Яны неабходныя ў ацэнцы нашай гісторыі

Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА на пасяджэнні Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта на базе НАН.

Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта быў створаны распараджэннем кіраўніка дзяржавы 4 лютага 2022 года ў Год гістарычнай памяці. «За гэты час зроблена нямала ў плане захавання гістарычнай гераічнай мінуўшчыны, выпрацоўкі падыходаў ацэнкі розных перыядаў гісторыі, захавання культуры і традыцый беларускага народа. Пэўны аб'ём работ праведзены па ўдасканаленні школьнай, універсітэцкай адукацыі. Гэта і выданне новых падручнікаў, увядзенне курса «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Увага ўдзялялася такой тэме, як музеязнаўства, арганізацыя выстаў. Саветам унесена лепта ў разгляд закона, які ўжо ўступіў у сілу і рэгламентуе дзейнасць у дадзеным кірунку: у сферы экскурсій, музейных экспазіцый; шэраг іншых пытанняў, у тым ліку як аб'екты нашай гісторыка-археалагічнай спадчыны выкарыстоўваць і ў экскурсійнай дзейнасці, і ў выхаванні моладзі. Сёлета работа будзе прадоўжана», — сказаў Ігар Сергеенка.

Па яго словах, шэраг мерапрыемстваў, пытанняў, якія планаваліся і разглядаліся летась, уносіўся як членамі савета, так і выканаўчымі камітэтамі, вучонымі, даследчыкамі. «Па ўсіх пытаннях знаходзілі рашэнні, пункты судакранання. Былі дыскусіі, спрэчкі. Асабліва калі стаяла пытанне аб выданні падручнікаў, аб фармаце, ацэнцы тых ці іншых гістарычных перыядаў і гістарычных асоб, — падкрэсліў Ігар Сергеенка. — Адна з галоўных задач савета — выпрацоўка адзіных падыходаў па ацэнцы нашай гісторыі. Адпаведна, укараненне яе ў наша жыццё: і ў адукацыю, і ў выхаваўчы працэс».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта расказаў, што педагогі ў рэгіёнах узнімаюць пытанне недахопу дакументальных фільмаў гістарычнай тэматыкі для дэманстрацыі школьнікам. Паводле яго слоў, трэба актыўна працаваць у такім напрамку, як стварэнне новых дакументальных фільмаў і тэлепередач гістарычнай тэматыкі. «Каб у шосты школьны дзень дэманстраваць добрыя дакументальныя, мастацкія савецкія фільмы; новыя, якія здымаліся летась», — адзначыў ён, прывёўшы як прыклад фільм «Ржэў. 500 дзён у агні». «Калі ён заблакіраваны ў інтэрнэце, дык яго ж можна паказаць, сабраўшы школьнікаў у адной зале. Прашу на гэта звярнуць увагу. Калі такая тэма называлася, было пажаданне — трэба яго рэалізаваць. Калі патрэбна нейкая дапамога з боку Міністэрства культуры, «Беларусьфільма» — дапамога будзе аказана», — сказаў Ігар Сергеенка.

У сваю чаргу, **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ,** які ўзначальвае ў савеце камісію па інфармацыйна-асветніцкай рабоце, заўважыў: «У рабоце як камісіі, так і сродкаў масавай інфармацыі чырвонай ніткай праходзіла гістарычная памяць. Работа СМІ ў большай ступені таксама была накіравана менавіта на гэту работу. Дзейнасць камісіі заключаецца ў пашырэнні ў грамадскай свядомасці і ў нацыянальнай медыяпрасторы аргументаванай гістарычнай праўды без супярэчнасцяў. У рабоце быў задзейнічаны патэнцыял вядучых дзяржаўных СМІ, навукова-экспертнай, культурнай супольнасцяў і грамадскіх арганізацый. Праведзена серыя навукова-практычных канферэнцый, круглых сталоў, дыялогавых пляцовак, іншых мерапрыемстваў па гістарычнай тэматыцы. На рэспубліканскім узроўні пляцоўкай для дыскусій сталі парламенцкія слуханні па тэматыцы гісторыі і сучаснасці Беларусі, пытанняў генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

Паводле яго слоў, ключавая роля ў навуковай распрацоўцы і рэалізацыі гістарычнай палітыкі ў кантэксце сучасных выклікаў і пагроз нацыянальнай бяспецы належыць Нацыянальнай акадэміі навук, Беларускаму інстытуту стратэгічных даследаванняў і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. «Комплексны міжгаліновы падыход і сістэмна выбудаваная інфармацыйная лінія дазволілі паслядоўна сфарміраваць у нашых грамадзян цікавасць да зададзеных падзей айчыннай гісторыі, заснаванай на дакладных фактах і дасягненнях беларускай дзяржаўнасці. Нам удалося сфарміраваць даволі аўтарытэтнае экспертна-аналітычнае асяроддзе для рэалізацыі масавай асветніцкай работы з насельніцтвам, з'явіліся новыя формы работы і новыя асобы», — адзначыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Паводле БелТА.

Грамадскі кантроль

ШТО ХВАЛЮЕ БУДАЎНІКОЎ?

Супрацоўнікі Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў праводзяць сістэмны грамадскі кантроль за ўмовамі працы на будпляцоўках, арганізоўваюць жывыя сустрэчы з працаўнікамі непасрэдна на будпляцоўках.

Сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Дзедлава», дзе маніторынг правёў **старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў будаўніцтва і прамбудматэрыялаў Дзмітрый МУРАШКА,** — філіял Гомельскага домабудаўнічага камбіната. Гаспадарка адна з найбольшых у Рагачоўскім раёне. Зараз на яе тэрыторыі мадэрнізуюцца малочнатаварныя вытворчасці. У мінулым годзе распачалі будаўніцтва арачнага каркасна-тэнтавага памяшкання для ўтрымання маладняку і капітальнага будынка на 300 галоў жывёлы. Новыя аб'екты дазволяць павялічыць пагалоўе і сканцэнтраваць дойны статак на асноўнай ферме ў Курганні, а аддаленую ферму выкарыстоўваць для дарошчвання маладняку. Кантралёры ад прафсаюзаў паназіралі за працэсам завяршэння будаўніцтва арачнага каркасна-тэнтавага памяшкання. На будпляцоўцы задзейнічаны як спецыялісты гаспадаркі, так і з Гомеля.

— Будаўніцтва дасць магчымасць аб'яднаць пагалоўе групы адкорму і паставіць у «арачнік» звыш 200 жывёл, якія знаходзяцца цяпер на адкрытым паветры, — растлумачыла **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Гомельскага домабудаўнічага камбіната Анжаліна СЫРАМЯТНІКАВА.** — Другое памяшканне з жалезабетону прадугледжана праектам для дзейна-малочнага блока «Курганне». Вытворчасцю жалезабетонных вырабаў і будаўніча-мантажнымі работамі займаюцца спецыялісты будкомплексу камбіната.

На аб'екце з'явіцца новая свідравіна і будзе ўзведзена водана-порная вежа. У будаўнічых планах гаспадаркі на гэты год — добраўпарадкаванне тэрыторыі зерняцтока.

— Загружанасць — галоўнае пытанне, якое адрасуюць будаўнікі, — расказаў старшыня галіновага прафсаюза. — Нягледзячы на тое што з-за санкцыйнага ціску склалася нятростая сітуацыя з прытокам інвестыцый у будаўнічую сферу, у нашым рэгіёне на гэты год прагназуецца нарошчванне аб'ёмаў выканання работ па дагаворах.

Дзмітрый Мурашка адзначыў, што сустрэчы на выязных аб'ектах дазваляюць будаўнікам задаць хвалюючыя пытанні як рабочага, так і асабістага характару.

— Напрыклад, у «Дзедлава» пацікавіліся, якія ёсць магчымасці і льготы для аздараўлення ў прафсаюзных здраўніцах нашага рэгіёна, — дадаў прафсаюзны лідар. — Асабістыя пытанні бяру на кантроль, каб вывучыць іх і аказаць чалавеку ўсю неабходную інфармацыйную дапамогу ці накіраваць яго да адказных службаў.

Старшыня прафсаюза будаўнікоў паведаміў, што другая мэта маніторынгу — захаванне бяспекі працы. Прафсаюзы праводзяць кантроль за ўмовамі працы на будпляцоўках у зімовы перыяд.

— Абавязкова глядзім стан бытавога памяшкання, умовы для адпачынку і абагрэву падчас працоўных перапынкаў, забяспечанасць прыборамі для разагрэву ежы і кіпячэння вады. Правяраецца захаванне нормаў рэжыму работы ў адпаведнасці з тэмпературай паветра. Асобная ўвага — на наяўнасць і выкарыстанне сродкаў індывідуальнай абароны, спецадзення і абутку. Вывучаем стан прылад і інструментаў, — патлумачыў Дзмітрый Мурашка.

Па яго словах, не менш важна, што сустрэчы дазваляюць ацаніць працоўны настрой работнікаў на месцах, даць тлумачэнні па пытаннях, якія іх цікавяць.

— Нашы работнікі актыўна цікавяцца агульнарэспубліканскімі тэндэнцыямі ў будаўнічай сферы, павелічэннем аб'ёмаў будаўніцтва аранднага жылля, цэнаўтварэннем на рынку будпаслуг, развіццём міжрэгіянальных сувязяў будпрадпрыемстваў, — рэзюмаваў Дзмітрый Мурашка.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Для адных — частка сябе, для другіх — тавар

СКРАЛІ, ПАКАЗАЛІ, НЕЗАКОННА ВЫКАРЫСТАЛІ...

Крыху больш за год таму ў краіне запрацаваў Закон аб абароне персанальных даных (ПД), кантроль за выкананнем якога ўскладзены на Нацыянальны цэнтр абароны персанальных даных.

Мноства паслуг, даступных дыстанцыйна, дазваляюць чалавеку эканоміць час, але ўзамен, здавалася б, бясплатных сэрвісаў, напрыклад прыпадсцы на пэўныя мабільныя праграмы, патрабуецца ўсё больш персанальнай інфармацыі пра асобу. Распрацоўшчык чамусьці просіць даць доступ да кантактаў адраснай кнігі ці даных сховішчаў мабільнага. Пазней гэтыя звесткі могуць выкарыстоўвацца самымі рознымі спосабамі, пачынаючы ад прадастаўлення нам розных рэкламных рассылак і заканчваючы прамым негатыўным уздзеяннем на чалавека, расказаў **Андрэй ГАЕЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных:**

— За час існавання закона створана ўся неабходная метадалагічная база для яго выканання. Распрацаваны неабходныя алгарытмы рашэнняў, шаблоны і ўзоры дакументаў, якія сабраныя ў так званыя партфелі аператараў (спецыялістаў, якія збіраюць і апрацоўваюць ПД). Уся неабходная інфармацыя для людзей змешчана на афіцыйных інфармацыйна-прававых рэсурсах цэнтра. Любы чалавек можа паскардзіцца на дзеянні аператара, калі правы асобы парушаюцца. Ад таго, як абачліва мы ставімся да інфармацыі пра сябе і блізкіх, залежыць фінальны станоўчы вынік, які не прынясе чалавеку праблем.

У цэнтры ёсць спецыялісты, якія маніторацъ сітуацыю ў інтэрнэце на прадмет фактаў незаконнага выкарыстання інфармацыі. Выяўляючы распаўсюджаныя масівы звестак пра людзей, яны прымаюць меры па іх выдаленні з сеткі. Летась было выдалена больш за 1,5 млн запісаў аб беларусах, прычым некаторыя выдаляліся па некалькі разоў, а базы даных суб'екта па аказанні паслуг «СДЭК-глобал» — увогуле 24 разы.

— Для шэрагу арганізацый звесткі пра людзей з'яўляюцца таварам. Аднак з часам каштоўнасць інфармацыі пра чалавека змяншаецца, і новыя спробы распаўсюдзіць звесткі пра асобу, якімі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота аўтара.

авалодалі зламыснікі, спыняюцца, бо чалавек мяняе пашпарт, нумар тэлефона, паролі і іншае. Працягнецца і адсочванне трансгранічнай перадачы даных, калі звесткі пра людзей перадаюцца кампаніям у іншых краінах. На жаль, ламаюцца базы даных і за мяжой, і звесткі пра беларусаў трапляюць у глабальную сетку, таму існуе шэраг пытанняў, звязаных з абаронай інфармацыі на тэрыторыі іншых дзяржаў, бо за парушэнні будзе адказваць наш нацыянальны аператар.

БІЯМЕТРЫЧНАЯ НЕБЯСПЕКА ПРАЗ ВОЧЫ І ПАЛЬЦЫ

Яшчэ адзін момант — відэаназіранне. З аднаго боку, гэта працуе на бяспеку, аднак на камеру трапляюць людзі, якія не хацелі б гэтага. Часта відэаназіранне вядзецца без папярэджання. Напрыклад, камеры на сценах жылых дамоў, з аднаго боку, дазваляюць бацькам назіраць за бяспекай дзяцей, а з другога — убачыць, хто з чым, з кім і ў якім стане ўваходзіць у пад'езд, — а гэта ўжо ставіць пад сумненне абарону яго прыватнага жыцця і складвае ўражанне пра мадэль яго паводзін. Таму важна ўрэгуляваць гэтыя пытанні заканадаўча і арганізацыйна. Цяпер у парламенце да другога чытання рыхтуецца праект па карэкціроўцы Грамадзянскага кодэкса, дзе прадугледжаны два артыкулы, якія будуць рэгуляваць пытанні, звязаныя з відэаназіраннем і відэаздымкай.

— Вельмі тонкае пытанне — збор біяметрычных звестак, асабліва пра непаўналетніх. У шэрагу школ і не толькі для ўваходу ва ўстанову практыкуецца счытванне радужнай абалонкі вока. Для ўваходу-выхаду дзяцей гэта празмерная апрацоўка, бо можна выкарыстаць для гэтага картку навучэнца, чалавека на вахце. Калі такую інфармацыю выкрадуць, то наступствы будуць вельмі непрадказальныя — яе можна будзе выкарыстаць пасля цягам усяго жыцця чалавека, такія звесткі не зменіш. Тое ж самае датычыцца ўваходу ў пэўную ўстанову па адбітках пальцаў — гэта такія ж біяметрычныя даныя, — дадаў Андрэй Гаеў.

ЗГОДА НА РАБОТУ НЕ ПАТРЭБНАЯ

Шчыльна будзе працаваць Цэнтр і адносна празмернага збору згод, якія павінны мець добраахвотны, адназначны і інфармаваны характар. У многіх арганізацыях замест таго, каб выканаць заканадаўчыя патрабаванні, у людзей масава збіраюць згоды на атрыманне і апрацоўку іх персанальных даных. У працоўных адносінах згод проста не можа быць з прычыны няроўнага становішча работніка і наймальніка. А ў многіх выпадках ідзе падмена паняцъяў, з'яўляецца паператорчасць, магчымасць для выкарыстання інфармацыі з парушэннем заканадаўства.

— Здараецца, што падчас прыёму на работу збіраюцца звесткі пра прыцягненне патэнцыяльных работнікаў да адміністрацыйнай адказнасці. Дзяржорганам яе дазволена выкарыстоўваць толькі ў сітуацыях, дазволеных заканадаўствам. А са згоды грамадзян арганізацыі масава збіраюць такія звесткі, хоць гэта прадугледжана толькі для асобных катэгорый работнікаў, — удакладніў спецыяліст.

Згодна з вынікамі сацыяльнага апытання, 75 % людзей разумеюць, што ПД — безумоўная каштоўная інфармацыя, 3 % гэта адмаўляюць, а 10 % — не ўспрымаюць усур'ёз. Пры гэтым чвэрць грамадзян нават не азнаямляецца з палітыкай выкарыстання ПД на сайтах, якімі карыстаецца. Таму варта і надалей павышаць інфармаванне насельніцтва пра каштоўнасць асабістай інфармацыі чалавека. У прыватнасці, у найбліжэйшы час у Беларусі будзе запушчаны цыкл сацыяльнай рэкламы аб важнасці абароны персанальных даных.

ГРЭБАВАЛІ ПРАВІЛАМІ — СТРАЦІЛІ ІНФАРМАЦЫЮ

Адна з важных задач цэнтра — супрацьдзеянне незаконнаму распаўсюджванню асабістых звестак беларусаў, якія ў першую чаргу несанкцыянавана трапляюць у інтэрнэт, і гэта датычыцца баз даных, што збіраюцца аператарамі. Апошнія, дарэчы, павінны паведаміць цэнтру аб парушэнні сістэм абароны ПД не пазней як праз тры дні, як ім стала вядома пра тое.

— Сёлета ў план праверак унесены 13 аператараў, якія валодаюць значнымі масівамі інфармацыі пра людзей. Гэта сфера гандлю, паслуг, банкаўскія і страхавыя арганізацыі, а таксама аператары, якія масава апрацоўваюць ПД непаўналетніх, — падзяліўся **Уладзімір КУЗУРА, начальнік упраўлення кантролю і аўдыту Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных.** — Згаданым аператарам ужо накіраваны паведамленні пра правядзенне праверак. Закон вызначае рызыкаарыентаваны падыход кожнага аператара пры апрацоўцы ПД і вызначэнні ім шэрага мер для абароны звестак, якія збіраюцца. Аднак існуе шэраг абавязковых патрабаванняў па забеспячэнні абароны звестак, што аператар павінен забяспечыць. Найбольш распаўсюджаныя парушэнні, якія дапускаюць аператары, звязаныя найперш менавіта з нерэалізацыяй або няпоўнай рэалізацыяй гэтых абавязковых мер. Яшчэ адна памылка — грэбаваннне ўнутранымі рэгламентамі падчас работы з канфідэнцыяльнай інфармацыяй: парушэнне парадку доступу да даных, тэхнічныя збоі ў інфармацыйных сістэмах (у тым ліку праз узлом), страта знешніх носьбітаў ці дакументаў, якія ўтрымлівалі асабістыя звесткі.

Найчасцей за ўсё у сетку трапляюць звесткі накшталт імя-прозвішча чалавека, нумар тэлефона, месца жыхарства, адрас электроннай пошты, рэквізіты для аўтарызацыі ў пэўных інфармацыйных сістэмах. Летась такім чынам у агульным доступе аказаліся звесткі аб кліентах гандлёвай сеткі «Суседзі» (звыш 630 тысяч кліентаў), «Вострaў чысціні і смаку» (больш як 140 тысяч), аператара дастаўкі ежы Just-eat (230 тысяч), прадпрыемства «Нацыянальны цэнтр маркетынгу і кан'юнктуры цэн» (звыш 55 тысяч), Белгазпрамбанка (каля 42 тысяч).

— Вынікам такіх уцечак інфармацыі можа быць выкарыстанне ПД зламыснікамі для супрацьпраўных дзеянняў. Гэта і званкі так званых службаў бяспекі банкаў, доступ да асабістай перапіскі праз электронную пошту ці да старонкі ў сацыяльных сетках і іншае, — падкрэсліў начальнік упраўлення. — Цэнтр патрабуе ад аператара найхутчэйшых ліквідацыі праблемы і паведамлення пра ўцечку кліентам. Асобы, вінаватыя ў парушэнні закона аб ПД, нясуць дысцыплінарную адказнасць. Супрацоўніка могуць звольніць, пакараць штрафам да 200 базавых велічынь і нават налажыць крымінальную адказнасць у залежнасці ад цяжару наступстваў здзейсненага ім парушэння. Пры гэтым магчымае пакрыццё маральнай шкоды суб'екту ПД, пацярпеламу ад іх незаконнага распаўсюджвання.

Парады па абароне асабістых даных

✓ Беражліва стаўцеся да сваіх і чужых даных.

✓ Не паведамляйце свае ПД, рэквізіты банкаўскіх картак і атрыбуты для аўтарызацыі на сайтах і ў праграмах невядомым асобам, кім бы яны ні прадстаўляліся.

✓ Не давайце па тэлефоне ці праз месенджар свае або чужыя ПД нават супрацоўнікам прававахоўных органаў.

✓ Не пераходзьце па невядомых спасылках і не адкрывайце сумніўныя паведамленні.

✓ Захоўвайце здаровы скептыцызм і не спяшайцеся выконваць чужыя інструкцыі, нават калі вы ўсхваляваныя.

✓ Уважліва вывучайце палітыку апрацоўкі ПД у аператараў.

✓ Перш чым даць дазвол здзяйсняць з вашымі данымі нейкія дзеянні, пацікаўцеся, як, чаму, на падставе чаго яны будуць апрацоўвацца, чаму патрабуецца менавіта ўказаны аб'ём ПД.

✓ Беражліва стаўцеся да копій сваіх дакументаў, асабліва тых, што сведчаць вашу асобу.

✓ Памятайце, што кожны з вас — міні-кантралёр уласных даных, які мае шмат правоў па іх абароне.

Як толькі невядомая асоба заводзіць гаворку пра грошы ці спампоўванне невядомых вам праграм (за якія зноў жа спатрэбіцца заплаціць) — адразу спыняйце дыялог.

Алічбаваны тастамент

У справе віртуальнага захоўвання дакументаў з натарыятам могуць паспрачацца толькі гістарычныя музеі і бібліятэкі

Пытанні алічбоўкі дакументаў, анлайн-узаемадзеяння з грамадзянамі, падрыхтоўкі да выбараў 2024 года, максімальнага пераводу натарыяльных паслуг у электронны выгляд, распаўсюджвання практыкі работы «спадчына без меж» на ўсю краіну... Гэтыя і іншыя тэмы абмяркоўваліся на пасяджэнні Беларускай натарыяльнай палаты.

— Натарыус — кансерватыўная юрыдычная прафесія, аднак інстытут натарыята з пункту гледжання інавацыйнай дзейнасці вельмі сучасны, — заўважыла **Вольга ЧУПРЫС, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.** — Папера старэе, а многія натарыяльныя дакументы захоўваюцца вечна. Адпаведна, неабходна іх асучасніць, каб яны былі даступныя для наступных пакаленняў. Менавіта з-за такой адказнасці натарыят і стварае лічбавы архіў на будучыню. У гэтым сэнсе іноўны орган, акрамя хіба гістарычных музеяў ці бібліятэк, не можа параўнацца з натарыятам. Па пытаннях узаемадзеяння з дзяржорганамі і грамадзянамі натарыят таксама напярэдзе ўсіх і забяспечвае анлайн-суправаджэнне сваёй дзейнасці.

Ва ўсіх абласных цэнтрах і сталіцы цяпер працуе прынцып «спадчына без меж», які зарэкамендаваў сябе як вельмі зручны для насельніцтва. Такая форма работы дае магчымасць звярнуцца да любога натарыуса акругі ў зручным для спадчынніка месцы, незалежна ад апошняга месца рэгістрацыі спадчынадаўца, расказала **Наталля БАРЫСЕНКА, старшыня Беларускай натарыяльнай палаты:**

— Мы плануем да 1 ліпеня прапрацаваць дадзены прынцып у межах усіх раёнаў нашай краіны, дзе больш як адна натарыяльная кантора. Тэхналагічна і арганізацыйна для гэтага ўсё гатова. Пакуль будзем назіраць, ці запатрабавана тое насельніцтвам, бо натарыят нічога не навязвае, а амаль усе паслугі маюць прынцып экстэрытарыяльнасці.

Асноўны вынік дзейнасці натарыята — забяспечанасць даступнасці для грамадзян атрымання натарыяльных паслуг. З аднаго боку, выкананы прынцып экстэрытарыяльнасці, з другога — увага засяроджана на мясцовасцях, якія і цяжкадаступныя для таго, каб у іх дабрацца, і натарыяльныя ўстановы там адсутнічаюць, акрэсліў галоўныя дасягненні за год **міністр юстыцыі Сяргей ХАМЕНКА:**

— Мы не маем ніводнай скаргі адносна неаказання паслуг ад жыхароў сельскай мясцовасці. І гэта своеасаблівая лакмусавая папера дзейнасці арганізацыі. Летась натарыят прыдбаў сур'ёзны аўтарытэт і на міжнароднай арэне, стаўшы базавай арганізацыяй для ўсіх натарыятаў краін СНД. А базавая арганізацыя — установа, ад якой пераймаюць вопыт, вучацца матэрыялы вядзення работы існуючай у нашых натарыусаў практыкі.

Сёлета неабходна правесці комплекс мерапрыемстваў па завяршэнні распрацоўкі і прыняцця дакументаў у рамках Канстытуцыйнай рэформы. Неабходна таксама падрыхтавацца да выбараў 2024 года, і натарыят як арганізацыя, якая аказвае паслугі ад імя дзяржавы, павінна стаць прыкладам.

— Слова «натарыус» асацыіруецца з тым, хто дасканала і дакладна выконвае законы ў інтарэсах грамадзян. І адной з задач стане прывядзенне ўсёй сістэмы і інфраструктуры, якая маецца ў натарыята, у такі выгляд, каб можна было прывесці любую ўпаўнаважаную асобу і сказаць «вось так павінна быць, вось узор зносін з людзьмі, узор разгляду звароткаў грамадзян», — дадаў міністр. — Адзін з вектараў для рэалізацыі — максімальная лічбавізацыя дзейнасці натарыусаў, каб чалавек змог атрымаць максімум паслуг не выходзячы з дому.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Ірына СІДАРОК.

АД ПАЛЕСКІХ АФІН ДА БЕЛАРУСКІХ МАЛЬДЫВАЎ

У МАНАСТЫР НА ГАРБАТУ

Мяркуеце, гэта не зусім на адрас? На думку Ірыны Радзецкай, у яе палескіх Афінах абсалютна нармальна спалучыць паломніцтва ў манастыр з атрыманнем асалоды ад свежай выпечкі і ўдзелу ў трапезе.

Ірына працуе настаўніцай гісторыі ў Слонімскай сярэдняй школе № 2 і мае пасведчанне экскурсавода. Можна ўявіць, колькі ўсяго цікавага ведае яна пра свой край. У тым ліку пра мясціны, якія не вельмі вядомыя. Ірына прапанавала новы экскурсійны маршрут пад назвай «Усе госці — у край палескіх Афін». З гэтым праектам яна перамагла ў намінацыі «Найлепшы тур выхаднога дня». Галоўная ўвага ў маршруце дадаецца духоўнай спадчыне.

Прапануе Ірына спачатку завітаць у слонімскі Свята-Благавешчанскі жаночы манастыр і наведаць іканапісную майстэрню. Пры напісанні абразоў тут выкарыстоўваюць толькі прыродныя матэрыялы, а іконы ўпрыгожваюць і сам манастыр, і Жыровіцкі манастырскі комплекс. Таксама тут пішуць іконы на заказ.

Манастыр мае падворак у вёсцы Парэчча Слонімскага раёна. Тут аднаўляецца храм святога Георгія Перамаганосца. Многім падворак запомніцца смачным хлебам і булачкамі, якія выпякаюць па старажытным рэцэпце. Усё гэта можна купіць, а таксама пакаштаваць манастырскай гарбаты і іншых страў.

Далей духоўны маршрут вядзе ў вёску Шылавічы, на ўскрайку якой знаходзіцца каменны крыж. Кажуць, што ён расце проста з зямлі, але каб упэўніцца ў гэтым, трэба наведаць Шылавічы некалькі разоў.

Можна завітаць у вёску Русакова, дзе размясціўся жаночы манастыр у гонар прападобнага Амвросія Оптынскага. Дарэчы, манахі Оптынай пустыні — знакамітага манастыра ў Калужскай вобласці Расійскай Федэрацыі — дапамагаюць беларускім манашкам. Насельніцы Свята-Амвросіеўскага манастыра, сярод іншага, вырошчваюць і нарыхтоўваюць лекавыя расліны, прафесійна складаюць з іх зборы. Тут можна атрымаць кансультацыю і зрабіць пакупку.

Яшчэ адзін пункт маршрута — Свята-Зосіма-Саваціеўскі мужчынскі манастыр у вёсцы Вялікая Кракотка. Непадалёку ад яго, больш за сотню гадоў з пяску прабіваецца гаючая крыніца, якую асвяцілі ў гонар Іаана Хрысціцеля. Ваду можна набраць, каб забраць з сабой. Дарэчы, у такія падарожжы варта браць адпаведныя ёмістасці.

У самім манастыры працуюць сталярныя майстэрні, дзе выраблюць царкоўную мэблю, ёсць пчальнік, тут можна набыць мёд і духмяныя «кракоцкія» свечкі. Па словах Ірыны, калі дамовіцца пра прыезд, турыстаў сустракае і частуе гарбатай з мёдам сам ігумен Міхей (Бараноўскі).

І гэта далёка не поўны маршрут, а толькі яго частка. Другі выхадны дзень Ірына прапануе прысвяціць Слоніму, дзе знаходзіцца нямала культавых гістарычных будынкаў, у тым ліку мячэць і сінагога.

«МАЛЬДЫВЫ» І СТАРАЖЫТНЫЯ ШАХЦЁРЫ

Гаворка пра прамысловы турызм. Дадзены кірунак пакуль не такі «раскручаны», як гістарычны ці экалагічны. У аддзеле спорту і турызму Ваўкавыскага райвыканкама задумалі спалучыць у адным маршруце вытворчасць і прыгожы ландшафт. Так нарадзіўся праект «Па слядах старажытных шахцёраў», які знаёміць з вытворчасцю цэменту і Краснасельскімі крэйдавымі кар'ерамі. Маршрут стаў пераможцам конкурсу ў сваёй намінацыі.

Па словах **начальніка аддзела Наталлі ЧУМАКОВАЙ,** на цэментным заводзе гатовыя падключыцца да праекта. На прадпрыемстве, якому больш за сто гадоў, ужо ёсць свой маршрут. Тут могуць правесці па заводзе, пазнаёміць з тэхналогіяй вытворчасці

цэменту, цэнтральным пунктам кіравання, музеем. Захаваліся шахты, дзе здабывалі крэмній першабытныя людзі. Аб старажытнай стаянцы сведчыць многае, у тым ліку і экспанаты музея.

Дарэчы, тут можна ўбачыць крэйдавыя адбіткі дагістарычных марскіх насельнікаў — двухстворкавага малюска, пектуса, марскіх вожыкаў, ракавін галаваногіх малюскаў аманітаў. А самаму старажытнаму — адбітку рыбы віду Хоплаптэрыкс — больш за 60 мільёнаў гадоў. Знайшлі гэты адбітак у 2004 годзе падчас работы на крэйдавым кар'еры. Можна разгледзець луску, плаўнікі і вачніцы рыбы. Сапраўднасць віду была ўстаноўлена навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Працэс выпуску цэменту звязаны са здабычай вапны. Пасля таго як кар'ер вычарпаў свой рэсурс, тэхніку пераводзяць на новыя распрацоўкі, а стары кар'ер запаўняецца вадой. У сувязі з тым, што на дне знаходзіцца крэйда, вада набывае бірузовы колер. Так з'явіліся вядомыя крэйдавыя кар'еры, якія ў народзе атрымалі назву «беларускія Мальдывы». Гэта зона заўсёды вабіла экстрэмалаў і аматараў фотасесій, хоць і была забаронена для наведвальнікаў. Але нядаўна на схіле распрацаванай дзесяць гадоў таму лінзы цэментным заводам абсталявана аглядальная пляцоўка. Цяпер рабіць фота на фоне стометровага кар'ера стала бяспечна. Пляцоўка добра замацавана, забетаніравана і агароджана. У іншым выпадку кар'еры нясуць пагрозу аматарам экзотыкі. Крэйда, якая стварае блакітна-смарагдавы колер вады, — парода няўстойлівая, берагі кар'ера схільныя да эрозіі, пра што папярэджваюць аўтары праекта. Маршрут працягласцю 45 кіламетраў разлічаны на шэсць гадзін незабыўных уражанняў.

Дарэчы, ёсць цікавы факт. У 1940 годзе на цэментным заводзе праходзіў пераддыпломную практыку будучы народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін, які заканчваў вучобу ў Гомельскім тэхнікуме будматэрыялаў. Праз гады ў лісце супрацоўнікам завода пісьменнік напіша: «Але, як бачыце, цэментніка з мяне не атрымалася. Захапіла літаратура...»

ШТО ЧУЕ «ЛЯСНОЕ ВУХА»

У конкурсе на найлепшы экалагічны маршрут перамог Лідскі лясгас з праектам «Парк "Горні" — жамчужына Лідскай зямлі».

Парк каля Ліды быў закладзены 140 гадоў таму і з'яўляецца помнікам прыроды мясцовага значэння. Закладвалі яго па ініцыятыве царскай дзяржаўнай лясной аховы. З той пары захаваліся ліпавыя алеі, асобныя насаджэнні лістоўніцы сібірскай, сасны Веймутава і звычайнай, дуба і ясеня. З рэдкіх можна назваць клён Гінала, вязы, грабы, чырвоны дуб, ніцую бярозу, белую таполю — усяго больш за 40 відаў дрэў і кустоў.

Тут растуць некалькі сотняў дрэў, чый узрост перайшоў стогадовы рубеж альбо набліжаецца да яго. Захаваць старыя дрэвы дапамагаюць сучасныя тэхналогіі. Самы старажытны насельнік — цукрысты клён. Ён яшчэ і самы магутны. Яго вышыня — больш за 30 метраў, а дыяметр больш за чатыры метры. У лясгасе былі закладчаны яго станам, бо дрэва развальвалася, адпала вялікая галіна. Але дзякуючы прынятым мерам клён працягвае свой век. Тут можна сфатаграфавацца побач з «Лясным духам». А «Лясному вуху» шэптам расказаць пра свае жаданні. Гэтых герояў стварыў мясцовы майстар у рамках міжнароднага праекта. Вынікам праекта таксама стала арганізацыя на тэрыторыі парка Экалагічнага адукацыйнага цэнтра. Ёсць тут і невялікая турыстычная база, дзе можна застацца на некалькі дзён.

Нядаўна ў парку з'явілася новая алея, якая вядзе да воінскага абеліска. Помнік Невядомаму салдату ўстаноўлены ў 60-х гадах мінулага стагоддзя. Месца расчысцілі, помнік аднавілі. Свае сямейныя дрэвы садзяць тут шлюбныя пары. Дарэчы, у парку можна ўбачыць цесна сплеценыя чарэшчаты дуб і ліпу, кроны якіх губляюцца ў вышыні. Аўтары праекта кажуць, што дрэвы спляліся, каб разам свой век дажываць і адно аднаго падпіраць.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота з адкрытых крыніц.

Надзея СЦЯПУРА, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў:

— У конкурсе на найлепшы новы турыстычны маршрут узялі ўдзел усе раёны Гродзеншчыны. Было даслана некалькі дзясяткаў заявак. Мы ўбачылі, колькі яшчэ новых, малавядомых, цікавых мясцін тоіць у сабе глыбінка. Галоўным крытэрыем была навізна. Але не толькі. Улічвалася і тое, як маршрут будзе працаваць, наколькі цікавыя аб'екты ён прапануе, як і хто пра іх зможа расказаць. Турыстам мала толькі бачыць прыгожы будынак ці прайсціся па старым парку, іх цікавяць падзеі і людзі, тайны, легенды. Маршруты-пераможцы будуць асвойвацца нашым турыстычным бюро падарожжаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Каля 2,8 мільёна чалавек у Францыі ўзялі ўдзел у пратэстах супраць пенсіённай рэформы

Пра гэта паведамляюць французскія СМІ са спасылкай на прафсаюз «Усеагульная канфедэрацыя працы» (CGT). Прычым у МУС Францыі ацанілі колькасць удзельнікаў — 1,2 млн чалавек. Французскія СМІ зазначаюць, што ў цэлым гэтым разам удзельнікаў акцый было больш, чым падчас першых маніфестацый 19 студзеня. Тады ўлады Францыі заяўлялі, што ў акцыях удзельнічаў 1 млн чалавек, а прафсаюзы, што 2 млн. Раней паведамлялася, што, паводле звестак CGT, у Парыжы на вуліцы выйшла паўмільёна. У сваю чаргу, у паліцыі французскай сталіцы адзначалі, што на дэманстрацыі сабралася менш чым 100 тысяч чалавек. Прафсаюзы заклікалі пратэстоўцаў выйсці на новыя акцыі 7 і 11 лютага.

Кіраўніком урада Экватарыяльнай Гвінеі ўпершыню ў гісторыі краіны стала жанчына

Прэзідэнт Экватарыяльнай Гвінеі Тэадора Абіянг Нгема Мбасога сваім указам прызначыў на пасаду прэм'ер-міністра краіны Мануэлу Рока Бацэй. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на паўднёваафрыканскую радыёстанцыю SABC. З 2016 года пасаду прэм'ера займаў Франсіска Паскуаль Абама-Асуе. Новы прэм'ер мае досвед работы ва ўрадзе, са жніўня 2020 года яна была міністрам-дэлегатам у міністэрстве адукацыі. Апошняя пасада Мануэлы Рока Бацэй — намеснік дэкана факультэта літаратуры і сацыяльных навук Нацыянальнага ўніверсітэта Экватарыяльнай Гвінеі.

Даходы Турцыі ад турызму перавысілі рэкордныя $46 млрд

Турцыя ўстанавіла новы рэкорд па даходах ад турыстычнай галіны — звыш $46,2 млрд па выніках 2022 года, гэта на 53,4 працэнта больш, чым годам раней. Аб гэтым паведаміла газета Hurriyet са спасылкай на даныя Інстытута статыстыкі Турцыі (TUIK). Летась Турцыю наведала больш чым 44 мільёны замежных турыстаў. Іх асабістыя расходы склалі $34,4 млрд, а траты ў рамках турпакетаў — звыш $11,8 млрд, піша выданне. Як адзначыў міністр культуры і турызму краіны Мехмет Нуры Эрсай, сёлета Турцыя плануе прыняць 60 млн турыстаў і атрымаць даход у памеры $56 млрд. У 2028 годзе краіна прагназуе рост турпатоку да 90 млн чалавек, а даходаў ад турызму — да $100 млрд.

Сямейная газета

Выпуск № 2 (205)

МЕТАД ПАМІДОРА

Днямі ўкладвала сына спаць. Пасля таго як пачыталі кніжку, ён, як звычайна, пачынае скакаць на ложку і гучна смяяцца. Урэшце, маё цярпенне лопаецца, і я павышаю голас. І тут сын выдае: «Мама, а памятаеш, у тваёй кніжцы напісана: «Мамачка, не крычы» (якраз напярэдадні я прынесла з бібліятэкі кнігу з такой назвай). «Ведаю, — кажу, — што крычаць на дзяцей нельга. Але ж ты мяне сам настойліва правакуеш на гэта. Я ўжо пяты раз прашу цябе легчы спаць, а ты не слухаешся. Вось скажы, што мне зрабіць, каб ты супакоіўся?» — «Ведаеш, калі ты на мяне крычыш, у мяне сэрца можа ўпасці і разбіцца. Ты лепш мяне проста абдымі і скажы: «Сымонка, міленькі, давай ужо спаць». І праспявай «Купалінку». — «Ну, давай паспрабуем», — кажу. Раблю тое, што ён сказаў, і вось дык цуд — мой неўтаймоўны, як па ўзмаху чароўнай палачкі, заціхае. «Дзякуй табе, такі дзейсны спосаб прыдумаў, — сказала яму раніцай. — Буду нагадваць табе пра яго штодня. І ты, калі раптам я забудуся і зноў павышу на цябе голас, таксама хуценька скажы слова-пароль «абдыманкі».

Пакуль не ведаю, якія парады даюцца ў кнізе «Мамачка, не крычы», але хачу падзяліцца з вамі яшчэ некалькімі эфектыўнымі метадамі, якія дапамагаюць мне ў штодзённым жыцці.

Пра цудоўную тэхніку «я-паведамленне» мне падчас інтэрв'ю на тэму бацькоўска-дзіцячых адносін распавяла псіхолаг. З таго дня я стараюся прымяняць яе ў дачыненні не толькі да сына, але і да мужа. Замест таго каб абвінавачіць іх у чымсьці і прад'явіць чарговую прэтэнзію, акцэнтуюся на сваіх пачуццях і агучваю іх. Замест «Выключы ты нарэшце музыку!» кажу «Музыка мне замінае сканцэнтравацца», замест «Зноў ты не прыбраў пасля сябе свае інструменты» — «Мне непрыемна, калі ў пакоі вэрхал». «Слухай, калі б ты ведаў, як мне было крыўдна... Я засмучаюся... Я перажываю...» Заўважыла, што як толькі пачала прымяняць у сваім сямейным жыцці тэхніку «я-паведамленне», мы з мужам зусім перасталі сварыцца і яшчэ больш зблізіліся.

Работа займае істотную частку нашага жыцця. Таму, лічу, вельмі важна зрабіць так, каб яна была ў радасць. Дарэчы, я вельмі люблю сустракацца з людзьмі, браць інтэрв'ю. Але калі прыходзіць час здымаць запіс з дыктафона, так захапляюся, што магу прасядзець перад экранам камп'ютара некалькі гадзін запар. У выніку адчуваю боль у вачах, стому ды спустошанасць. Апошнія месяцы па парадзе сяброўкі пачала практыкаваць метад... памідора, прыдуманы італьянцам Франчэска Чырыла. Стаўлю будзільнік (сам Франчэска карыстаўся механічным кухонным таймерам у выглядзе памідора, таму так і назваў сваю тэхніку) на 25 хвілін і працую, не адхіляючыся на званкі і месенджары, затым раблю пяціхвілінны перапынак. І так чатыры заходы. Пасля чацвёртай 25-«хвілінкі» раблю перапынак на паўгадзіны. Такая тэхніка кіравання часам дапамагае не стамляцца, пераключацца, асвяжаць думкі.

Яшчэ адну тэхніку работы ў радасць прыдумала чатырохгадовая дачушка маёй сяброўкі Тані. Яе так і назвалі — «Алісіна клумба». А пачалося ўсё з таго, што дзяўчынка села рабіць маме ў падарунак аплікацыю. «Палянка» яшчэ і напалову не была запоўненая кветкамі, як малеча ўжо стамілася. «Мама, нічога, калі я наклею гэту кветачку і больш не буду?» — сумна ўздыхае Аліса. — «Нічога. Рабі справу, пакуль яна прыносіць табе радасць. А потым адкладай і займайся іншым. Пазней зможаш вярнуцца», — сказала мама і прызналася, што сама здзівілася сваёй мудрасці. На наступны дзень Таня вырашыла прымяніць «Алісіну клумбу» на справе. Напісала спіс задач. І пачала рабіць часткамі, у некалькі падыходаў, пераключаючыся з адных спраў на іншыя. Я таксама не раз заўважала, што змена дзейнасці не толькі засцерагае ад выгарання, але і ўзнімае эфектыўнасць працы ды, што немалаважна, настрой.

Калі здараецца нешта, што нам не падабаецца, можна змяніць сітуацыю альбо (калі першае нерэальна) сваё стаўленне да яе. Мне пашанцавала: я нарадзілася са здольнасцю шукаць штосьці станоўчае ў тым, што зусім не радуе. Калі ў вас няма такой якасці, можна яе развіць, як гэта рабіла дачка святара з кнігі Элінар Портэр. Паліяна марыла аб прыгожай ляльцы. Але ў пасылцы, якая прыйшла ёй з дабрачыннага камітэта, памылкова аказаліся дзіцячыя мыліцы. Дзяўчынка спачатку засмуцілася. Але тата сказаў: «Паліяна, трэба радавацца!» Здавалася б, чаму можна радавацца, калі замест лялькі табе даюць мыліцы? «Радуйся, што яны табе не патрэбныя!» З таго часу Паліяна пачала гуляць у радасць. Правілы вельмі простыя: трэба ва ўсім знаходзіць што-небудзь такое, чаму можна ўсміхнуцца...

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Тыя, хто побач

Святлана ПАДРЭЗ:

«У СЯМ'І МЫ ГАВОРЫМ НА МОВЕ ЛЮБОВІ»

У іх кар'еры былі дзве працяглыя замежныя камандзіроўкі, якія ўспрымаюцца як цікавыя прыгоды. Але самае важнае рашэнне ў жыцці — стварыць сям'ю, якой сёлета споўніцца 44 гады, — яны прымалі дома. Перакладчыкі з некалькіх замежных моў, Святлана і Генадзь ПАДРЭЗЫ, здзівіліся цікавасці журналіста да сваіх персон: маўляў, мы — звычайная сям'я, не знакамітасці. Але, перафразуючы класіка, кожная звычайная сям'я незвычайная па-свойму, у чым я ўпэўнілася падчас размовы.

З дзецьмі Алесем і Валяй.

Святлана і Генадзь ПАДРЭЗЫ.

— Пачнём з пачатку: дзе вы пазнаёміліся?

Генадзь Віктаравіч (Г. В.): У Алжыры, куды прыехалі працаваць па кантракце як перакладчыкі. Што цікава, у мінскім інязе мы нават не былі знаёмыя, верагодна, таму што вучыліся на розных факультэтах: я — на перакладчыцкім, Святлана — на педагагічным. А ў Алжыры трапілі ў адзін цэнтр прафтэхадукацыі...

— А як удалося атрымаць працу за мяжой, не будучы сямейнымі людзьмі?

Г. В.: Гэта міф, што ў савецкі час толькі сямейныя маглі выехаць на працу за мяжу. Па-рознаму было. Усё залежала ад пасады спецыяліста і тэрміну камандзіроўкі. Напрыклад, паслы выязджалі на тры-пяць гадоў з сем'ямі, таму што, акрамя ўсяго іншага, па пратаколе на прыёмы трэба прыходзіць з жонкай. А я — звычайны перакладчык з кантрактам на адзін год, таму ніякіх патрабаванняў да сямейнага статусу не прад'яўлялася.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Школьныя будні

НАСТАЎНІКІ + ВУЧНІ + БАЦЬКІ = адмысловыя традыцыі

Далучэнне бацькоў да школьнага жыцця дзяцей, паразуменне з настаўнікамі і ўдзел ва ўсіх значных мерапрыемствах установы адукацыі. Магчымасць уплываць на ўнутрышкольную стратэгію праз прысутнасць на педсаветах і ўнясенне прапаноў па афармленні класаў і наладжванні вучэбнага працэсу. Зваротны водгук ад настаўнікаў у выглядзе падзячных лістоў, якія дасылаюцца са школы на работу бацькам і маці. Такая формула стасункаў «настаўнікі + вучні + бацькі» існуе ў сярэдняй школе № 164 г. Мінска. Падобная практыка і створаныя дзякуючы ёй традыцыі прыходзяцца даспадобы ўсім тром бакам — удзельнікам школьнага жыцця. Чым так прываблівае школа і што робіцца для стварэння натхняльнай атмасферы для ўсіх, расказала дырэктар установы Святлана БАГДАШОВА.

Работа з усімі ўдзельнікамі навучальнага працэсу ў школе выбудоўвалася шляхам спроб і памылак, з адбором найбольш эфектыўных і запатрабаваных спосабаў стасункаў.

— Актыўнае ўключэнне бацькоў у адукацыйны працэс — справа складаная, — лічыць дырэктар. — Вельмі важна знайсці эфектыўныя формы работы, якія былі б цікавыя бацькам, каб тыя адчувалі сябе не пасіўнымі гледачамі і слухачамі, а непасрэднымі ўдзельнікамі працэсу.

(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)

Не трапіць у пастку

НЕБЯСПЕЧНАЯ ГАДЖЭТАМАНІЯ

Ці лечыцца гэтая залежнасць і як яе папярэдзіць

У жыцці нашых дзяцей з'явілася бомба запаволенага дзеяння. Круглыя суткі яе гадзіннікавы механізм цікае ў дамах і школах, становячыся прычынай істэрык, стрэсаў і сямейных сварак. Гэта бомба — інтэрнэт-залежнасць, звычка надоўга ўтаропліваць ў экраны планшэтаў і смартфонаў...
Так пачынаецца кніга дзіцячага псіхолага Элізабет Кілбі «Гаджэтаманія: як не страціць дзіця ў віртуальным свеце». Перад тым як пісаць гэты матэрыял, я паразмаўляла з сямейным псіхолагам Таццянай ШАРАНДАЙ, а таксама прайшла майстар-клас «Гаджэтаманія: норма ці залежнасць» псіхолага і мамы пяці дзяцей-пагодкаў Карыны РЫХТЭРЭ. І сёння хачу падзяліцца думкамі, якія мяне ўразілі і падаліся вельмі важнымі.

ДАЗВАЛЯЙЦЕ ДЗІЦЯЦІ СУМАВАЦЬ

Тое, што гаджэты выклікаюць моцную залежнасць і сур'ёзна ўплываюць на псіхічнае і фізічнае здароўе, думаю, ні для кога не сакрэт. Таму сёння хочацца пагаварыць не пра шкоду планшэтаў і смартфонаў, а пра тое, як прывіць дзіцяці здаровыя прывычкі карыстання лічбавымі прыладамі. І што трэба рабіць бацькам, каб выцягнуць падлетка з пасткі, у якую ён трапіў, вярнуць інтарэс да рэальнага жыцця і пры гэтым не сапсаваць адносіны.

Стрэтэгія дзеянняў залежыць ад узросту дзіцяці. Да сямі гадоў яго асноўная задача — гуляць. Калі ж дзіця ў 5-6 гадоў можа заняць сябе толькі мульцікам — гэта трагедыя. Трагедыя нашага часу. А пачынаецца ўсё з таго, што некаторыя «прагрэсіўныя» бацькі даюць смартфон дзіцяці ледзь не з самага нараджэння. (Сама не раз бачыла, як малеча, якая яшчэ не ўмее гаварыць, ужо водзіць пальцам па сэнсарным экране, механічна пераключаючы ролікі на YouTube.) А потым здзіўляюцца, калі ў тры гады сын ці дачка кажа, што ім сумна без мульцікаў.

— Дазваляйце дзецям сумаваць — гэта карысна, — у адзін голас кажуць псіхолагі. — Здольнасць самастойна сябе забаўляць, прыдумваць гульні, фантазіраваць — вельмі важны навык, які яны павінны асвоіць. І ўжо даказана, што гэты навык атрафіруецца, калі ў дзіцяці ёсць лёгкая для мазгоў і заўсёды даступная альтэрнатыва ў выглядзе тыцкання ў экран. «Я буду варыць суп, а ты пасумуй». Як правіла, праз некалькі хвілін пасля сумавання прыходзіць натхненне. І большасць дзяцей знаходзяць, чым сябе заняць. Бо сум — гэта выдатны трэнажор для фантазіі.

«Дзеці могуць злавацца на нас, крыўдзіцца, крычаць: «Ты самая жудасная мама на свеце! Я цябе не люблю!» У гэты момант важна захоўваць спакой».

Псіхолагі раяць да трох гадоў выключыць любыя гаджэты, бо ў дзіцяці няма ў іх патрэбы. А прывыканне і залежнасць у такім узросце развіваюцца за лічаныя тыдні. Разам з тым рэальнасць такая, што, згодна з даследаваннем лабараторыі Касперскага, у 54 працэнтаў дзяцей да 4-6 гадоў ужо ёсць свой планшэт ці тэлефон. З гаджэтазалежнасцю цяжка змагацца яшчэ і таму, што планшэт вельмі зручны самім бацькам. Яны выкарыстоўваюць яго як кнопку «выключэння» дзіцяці. Дастаткова ўключыць мульцік — і больш не чуваць бясконцага «мам, паглядзі». Ведаю, што многія мамы ўключаюць дзецям мульцікі, каб паспець прыгатаваць вячэру ці прыбраць у кватэры, але псіхолагі раяць гэтага не рабіць. А, наадварот, падключаць малых да сваіх спраў па гаспадарцы. «Давай разам мыць падлогу, змагацца з пылам, ляпіць пельмешкі». Так вы не толькі зробіце свае справы, але і праведзяце час з дзіцем.

— Я не кажу, што гаджэты — абсалютнае зло і нам трэба іх спаліць на вогнішчы, — удакладняе Карына Рыхтэрэ. — Калі вы сталіліся і вам проста хочацца папіць кавы ў цішыні альбо тэрмінова зрабіць важны званок, уключыце мульцік. Я кажу пра тое, каб не рабіць іх бескантрольны прагляд штодзённай традыцыяй.

НЕ БОЙЦЕСЯ БЫЦЬ ДРЭННАЙ МАМАЙ

Вядома, ідэальны сцэнарый не дапусціць залежных паводзін — з самага ранняга ўзросту сачыць за тым, каб дзіця цікавілася рэальным жыццём больш, чым віртуальным. Але для гэтага ўзаемадзеянне з бацькамі павінна быць хоць бы на дзесяць працэнтаў больш цікавым, чым мульцік ці камп'ютарная гульня.

— Для чалавека няма нічога смачнейшага за задавальненне, — кажа Таццяна Шаранда. — Умоўна кажучы, мы не будзем есці нясмачны селядзец, калі ёсць смачная ікра. Гаджэт — тое ж самае. Калі ён выходзіць на ўзровень нясмачнага селядца, а кантакт з мамай, як чырвоная ікра, становіцца смачным, можна казаць пра тое, што гаджэтазалежнасць будзе ўзята пад кантроль. Задача бацькоў — захапіць дзіця сабой. А для гэтага трэба ўдзяляць яму больш часу, праяўляць ініцыятыву. Пайшлі разам у музей, паехалі ў Ратамку на конях катацца... Задача бацькоў — арганізаваць баўленне часу без тэлефона: секцыі, гульні, паездкі. Паказаць, што рэальнае жыццё цікавейшае за віртуальнае.

Акрамя таго, псіхолагі раяць бацькам з самага пачатку ўвесці правілы карыстання гаджэтамі: колькі, калі і што можна глядзець. Але калі прыходзіць час выключаць гаджэт, малеча, як правіла, пачынае плакаць. Потым слёзы перарастаюць у істэрыку і нават агрэсію. Гэта сігнал, што ў вашага малога вельмі шмат экраннага часу. І трэба ўводзіць строгія правілы. Калі ўстанаўліваем абмежаванні — вельмі часта ў вачах дзіцяці мы становімся дрэннай мамай. І гэта нармальна. Дзеці могуць злавацца на нас, крыўдзіцца, крычаць: «Ты самая жудасная мама на свеце! Я цябе не люблю!» У гэты момант важна захоўваць спакой. Можна сказаць: «Я бачу, што ты расстроены. Але мой абавязак як маці клапаціцца пра тваё здароўе. Я маю права ставіць абмежаванні, а ты маеш права засмучацца». Сучасныя бацькі баяцца, што дзіця расстроіцца, не ўмеюць нармальна рэагаваць на іх эмоцыі. Менавіта таму многім мамам прасцей уключыць яшчэ адзін мульцік, толькі б малеча не плакала... Але гэта пастка: як толькі мы ідзём на павадку ў свайго дзіцяці — адразу прайграем.

— Калі дзіця раз за разам пераходзіць на істэрыкі, як толькі мама хоча выключыць мульцік, я магу дакладна сказаць, што яна ўжо не раз зрывалася на дзіця, крычала і ўрэшце... уключала мульцік, — кажа Таццяна Шаранда. — У такой сям'і няма паслядоўнасці ў выхаванні, няма аўтарытэту бацькоў. Уявіце сітуацыю: дзіця падышло да берага. Мама кажа: «Тут вельмі небяспечна, ты можаш упасці». І адводзіць малога ўбок. Адзін раз адвяла, другі, трэці. Кожны раз мама дакладна абазначае: сюды нельга. У выніку рана ці позна дзіця прыме правіла і не будзе імкнуцца яго парушаць. Калі дзіця разумее, што слова мамы — жалезабетоннае, то слёзы і істэрыкі з часам знікнуць. Я раю ўсім мамам: асвойце трансавыя тэхнікі, навучыцеся пераканаўча гаварыць нізкім спакойным голасам.

«Я З ТАБОЙ НЕ РАЗМАЎЛЯЮ»

У 7—13 гадоў ужо практычна ва ўсіх дзяцей ёсць свой тэлефон. Таму псіхолагі раяць: як толькі вы яго набылі, устанавіць на смартфон дадатак «Бацькоўскі кантроль», пры дапамозе якога можна кантраляваць не толькі час знаходжання ў інтэрнэце, але і кантэнт. Не варта чакаць, што дзеці самі будуць кантраляваць экранны час, бо сіла волі пачынае фарміравацца толькі з сямі гадоў. Асноўная задача бацькоў — навучыць дзіця карыстацца гаджэтам правільна, без крайнасцяў і перакосаў, успрымаць яго як карысны інструмент для вырашэння задач, не больш. А зрабіць тое можна толькі ўласным прыкладам. Таму вельмі важна, каб бацькі самі не «завісалі» ў інтэрнэце. Калі ў іх таксама залежнасць, трэба мяняць правілы для ўсіх: напрыклад, за 1-2 гадзіны да сну не карыстаемся гаджэтамі, ніякіх тэлефонаў не павінна быць падчас ежы. Можна ўвесці нават сямейныя дні без гаджэтаў.

Пасля 13 гадоў кантроль заканчваецца і пачынаецца ўплыў, які немагчымы без бацькоўскага аўтарытэту і цёплых даверлівых адносін. Калі вы іх не выбудавалі — самы час гэтым заняцца.

На майстар-класе мяне ўразілі дзве гісторыі з жыцця. «Сыну 11 гадоў. Калі я забрала ў яго тэлефон, ён кінуўся ў істэрыку і нават ударыў мяне. Цяпер я кантактую з ім суха, без пяшчоты», — падзялілася сваім болем адна мама.

«Задача бацькоў — арганізаваць баўленне часу без тэлефона: секцыі, гульні, паездкі. Паказаць, што рэальнае жыццё цікавейшае за віртуальнае».

— Пазбаўленне дзіцяці кантакту — самая грубая памылка, якую мы можам зрабіць. Гэта тое, што разбурае адносіны, — кажа Карына Рыхтэрэ. — Нельга адштурхоўваць ад сябе дзяцей. Адкіданне дзіцяці — гэта эмацыянальны гвалт. Такім метадам вы не справіцеся з залежнасцю ад гаджэтаў — стане яшчэ горш. Хлопчык не справіўся са сваімі эмоцыямі, са сваёй залежнасцю, якую вы ж і дапусцілі — і вы яго за гэта яшчэ і караеце. Гэта не віна дзіцяці. «Я з табой не размаўляю» — гэта не выхаванне. Вучыцеся размаўляць. Скажыце: «Мне шкада, што атрымалася такая сітуацыя. Мне было балюча. Давай з табой думаць, як мы дайшлі да такога жыцця, што нам трэба мяняць? Як мы з табой маглі б разам бавіць час?» Неабходна наладжваць адносіны. Бо яны — асноўны ключ уплыву, асабліва ў падлеткавым узросце.

Другая гісторыя больш сумная. Дзяўчынка-падлетак падышла да мамы і сказала: «Аддай тэлефон, або зараз я сябе зарэжу». Атрымаўшы тэлефон, дачка паклала нож пад падушку, каб тая не ўздумала зноў забраць...

Калі для дзіцяці жыццё без гаджэта страціла сэнс — гэта крайні пункт залежнасці. У падлеткавым узросце наогул вельмі небяспечна забіраць тэлефон адразу, бо гэтым вы толькі выклічаце да сябе нянавісць і агрэсію. Пасля 13 гадоў псіхолагі раяць дзейнічаць паводле падлеткавай стратэгіі, калі вельмі павольна, паступова выцягваем дзіця з віртуальнага свету ў рэальны.

— Што можна параіць маме дзяўчынкі? Ці трэба ёй адразу ж пасля таго, як аддала тэлефон, паразмаўляць з дачкой? — пацікавілася я ў псіхолага.

— Не, у такіх сітуацыях дыялог паміж мамай і дачкой пачынаецца толькі тады, калі ёсць ініцыятыва з боку падлетка. Нават проста прыйшла і сказала: «Што мне паесці?» Мама, будзь у гэты момант мудрэйшая, не згадвай пра тую сітуацыю. Спачатку пакармі яе. Спрацоўвае стары эвалюцыйны механізм — дачка супакойваецца. Ужо потым у працэсе ежы маме трэба сказаць: «Ведаеш, мне было вельмі балюча з-за таго, што адбылося паміж намі. Рукі апусціліся, хацелася плакаць». Мама павінна гаварыць вельмі ціха. І без абвінавачанняў у бок дачкі. Гэта не павінен быць працяглы маналог, усяго 2-3 хвіліны. Няхай дачка есць, а маці павінна сысці з кухні. Гэта будзе першы крок да працэсу рэфлексіі ў дзіцяці. Маме трэба наладжваць страчаны кантакт. Спакойна пачынаць выбудоўваць даверлівыя адносіны. Гэта сур'ёзная доўгая работа маці ў першую чаргу над сабой. Я на яе месцы пацікавілася б, што падабаецца дачцэ ў гаджэце. Калі дзяўчынка бязвылазна сядзіць у ТікТок і глядзіць ролікі пра катоў ды сабак, прапануйце схадзіць разам на выстаўку жывёл, завядзіце шчаня, няхай яна яго трэніруе, удзельнічае з ім у спаборніцтвах. Хай скіруе фокус увагі на фізічную актыўнасць!

У 8 гадоў, вядома, прасцей выцягнуць дзіця з залежнасці, чым у 13—15. Больш за тое, наступае крытычны момант, калі гаджэтазалежнасць не лечыцца. Але нават у такім выпадку можна паспрабаваць перавесці прывязанасць да гаджэтаў у сацыяльна прымальны кірунак. Напрыклад, «любіш сядзець у ТікТок — станавіся блогерам, апантаны анлайн-гульнямі — паступай на праграміста... Ты можаш разлічваць на маю падтрымку...» Вельмі важна не разбіць адносіны аб пастаянныя прэтэнзіі, крыкі, крыўды, заўвагі. Калі мы ўвесь час транслюем дзіцяці незадаволенасць — нічога добрага не будзе.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Колькі часу дзіця можа праводзіць у гаджэтах, каб не стаць залежным ад іх?

- Да 3 гадоў: няма патрэбнасці ў экранным часе;
- 3—5 гадоў: 10—20 хвілін на дзень;
- 5—7 гадоў: 20—30 хвілін на дзень, у выхадныя магчымы прагляд поўнаметражнага фільма;
- 7—10 гадоў: 30—40 хвілін на дзень, у выхадныя 60—90 хвілін на дзень;
- 10—13 гадоў: 40—60 хвілін на дзень, у выхадныя 60—90 хвілін на дзень;
- 13—18 гадоў: свой тэлефон, але існуюць пэўныя правілы карыстання гаджэтам.

«У СЯМ'І МЫ ГАВОРЫМ НА МОВЕ ЛЮБОВІ»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Камандзіроўка не стала нечаканасцю. Ужо на 5 курсе адбылося так званае размеркаванне, будучыя выпускнікі ведалі, якая работа іх чакае: з перакладчыцкага факультэта, як правіла, у асноўным размяркоўваліся за мяжу, а з педагагічных факультэтаў — у школу.

Праўда, мне прапаноўвалі і выкладчыкам на кафедру факультэта. Сказалі: напішы адмову ад Алжыра. Падумаў: што мяне чакае на кафедры, ведаю, а што такое Алжыр, не ведаю, таму паеду туды.

Святлана Уладзіміраўна (С. У.): Думаю, у той год проста не хапала савецкіх спецыялістаў у краінах, якія развіваліся. Таму накіроўвалі і дзяўчат з нашага педагагічнага факультэта. Прапанавалі камандзіроўку, я і пагадзілася. У маладосці ж усё цікава і нічога не страшна.

— Вернемся да знаёмства. Гэта было каханне з першага погляду?

С. У.: Паўгода вачэй не адводзілі ад падручнікаў, слоўнікаў. Інтэрнэту ж у той час не было. Наша работа заключалася ў тым, што выкладчык — у маім выпадку дысцыпліны «Тэхналогія металаў» — чытаў лекцыю, а я перакладала. Каб пераклад атрымліваўся якасны, а не механічны, трэба было разумець прадмет. На шчасце, мне няцяжка было яго вывучыць.

Святлана Уладзіміраўна з унучкамі Аляксандрай і Дашай.

Ну і паколькі мы адзначалі ўсе савецкія святы, так і пазнаёміліся, як я кажу, станцаваліся.

— Што можна сказаць пра бытавыя ўмовы, у якіх вы жылі?

С. У.: Першыя два месяцы ўсё падабалася. Пасля раптам заўважаеш, што на занятках сядзіш у куртцы і ботах. У аўдыторыі не было ацяплення, нашы выкладчыкі рабілі абагравальнікі. Заўсёды кажу, што нідзе так не мерзла, як у Паўночнай Афрыцы. Зімой там холадна, а летам каля 50 градусаў цяпла. Але ў маладосці ўсё гэта лёгка пераносілася.

— А як вам працавалася на кантыненце?

Г. В.: СССР залажыў асновы дружбы і супрацоўніцтва з Алжырам. Там існавала магутная сістэма падрыхтоўкі кадраў. Сотні тысяч алжырцаў вучыліся ў «рускіх» — так звалі ўсіх савецкіх грамадзян незалежна ад таго, хто ты па нацыянальнасці, з якой рэспублікі прыехаў. А што датычыцца лінгвістычных ВНУ, то дагэтуль ганаруся, што выпускнік мінскага «ін'яза» — у той час ён высока каціраваўся. Наогул, у Савецкім Саюзе было тры магутныя «ін'язы» — у Маскве, Горкім (Ніжнім Ноўгарадзе) і Мінску. Аб работе ў Алжыры засталіся добрыя ўспаміны.

— Генадзь Віктаравіч, памятаеце, як зрабілі прапанову Святлане Уладзіміраўне?

— Вядома. Мы прыехалі ў Мінск пасля завяршэння кантракта. Я ўжо ведаў, што для

На Мадагаскары.

мяне яшчэ на год плануецца камандзіроўка. Вось тады і зрабіў прапанову Святлане: зразумеў, што не хачу яе губляць.

— А ў Алжыры вы яшчэ не былі ў гэтым упэўненыя?

Г. В.: Хутчэй, там я не задумваўся пра тое. Усё ж мы жылі на чужыне, там было адчуванне часовасці быцця. Гэта, ведаеце, як нейкая прыгода, якая табе падабаецца і цікавая, але ты разумееш, што сапраўднае жыццё пачнецца, калі прыедзеш дадому.

— Святлана Уладзіміраўна, а вы адразу прынялі прапанову або папрасілі час на роздум?

— Так, пагадзілася адразу. Калі шчыра, у Алжыры нават не думала аб замужжы. Ну, або думала, што не думаю *(смяецца)*. А дома таксама зразумела, што не хачу страчваць Генадзя. Хоць усё было няпэўна: у яго — кантракт, у мяне — не. Дазволяць мне выезд як жонцы ці не, невядома.

— І як усё склалася?

Г. В.: Найлепшым чынам. Святлане не толькі дазволілі выезд, але з'явіўся кантракт і для яе, а пакуль дакументы праходзілі ўсе інстанцыі, яна тры тыдні папрацавала ў Маскве.

— Ваш сын нарадзіўся, калі вы былі ў камандзіроўцы. Не страшна было нараджаць у чужой краіне?

С. У.: Не страшна, таму што нам не дазвалялі там нараджаць. За чатыры месяцы да родаў паляцела дадому.

— Як уладкоўвалі жыццё ў Мінску пасля замежжа? Як вырашылі жыллёвае пытанне?

Г. В.: Чарга на дзяржаўную кватэру была доўгая, на кааператыў у нас яшчэ не хапала грошай. Жылі ў майго бацькі, мама, на жаль, памерла вельмі рана...

— Святлана Уладзіміраўна, ці лёгка было ўжыцца са свёкрам?

— Не магу сказаць, што ўзнікалі нейкія нагоды для канфліктаў, якія я проста ненавіджу. Заўсёды можна дамовіцца, тым больш свёкар па характары быў чалавек добры.

Г. В.: У бацькі было цяжкае жыццё, у 1942 годзе, у 14 гадоў трапіў у партызанскі атрад у Віцебскай вобласці. А сям'я мамы жыла недалёка ад Хатыні, дзядзька, брат мамы, таксама быў партызанам... З узростам усё больш дакараю сябе, што мала дапамагаў бацьку. Цяпер думаю, што можна было больш для яго зрабіць, неяк аблегчыць жыццё. А калі быў малады, здавалася, што тата моцны і сам з усім справіцца.

— Ваша наступная камандзіроўка была на Мадагаскар. Туды ўжо вы паехалі ўсёй сям'ёй, з маленькімі дзецьмі. Як уладкаваліся?

Г. В.: Я працаваў, а Святлана займалася домам.

С. У.: Па статусе нам выдзелілі хатнюю прыслужніцу, хоць я супраціўлялася. Маўляў, сама спраўлюся, не трэба. Прыйшлося пераступіць праз сябе, каб прымаць яе працу. Яна вельмі старалася, рукамі мыла бялізну лепш, чым машынка.

— У вашых дзяцей невялікая розніца ва ўзросце. Яны сябравалі?

С. У.: Дзеці ў нас добрыя, але розныя па характары, да таго ж хлопец і дзяўчынка, таму асаблівага сяброўства не было. У дзяцінстве яны маглі і пабіцца. Але адчуванне, што яны — адна сям'я, што адзін за ўсіх і ўсе за аднаго, ёсць.

— Якіх прынцыпаў выхавання вы прытрымліваліся?

С. У.: Цяпер разумею, што была занадта патрабавальная. Часам глядзела на іх вачыма настаўніка. Бацькам заўсёды хочацца, каб дзеці былі ідэальныя... Нядаўна яны расказалі мне, што крыўдзіліся, калі дома карміла іх перад тым, як адпусціць да сяброў на дзень нараджэння. Але тады мне падавалася, што так правільна. Цяпер, вядома, усё па-іншаму. Рада, што ёсць унучкі і я магу выканаць «работу над памылкамі».

Г. В.: Прызнаюся шчыра, што ўдзяляў дзецям недастаткова ўвагі. Усе гэтыя мужчынскія адгаворкі аб рабоце, занятасці... Маё пакаленне, думаю, проста не ўмела сказаць дзецям, што мы іх любім, — адсюль і мала ўвагі, сумесна праведзенага часу. Можа, дзеці мудрэйшыя за нас? Прынамсі, цяпер у нас атрымліваецца сябраваць з дзецьмі.

— Яны пайшлі па вашым прафесійным шляху. Уплывалі на іх выбар ці далі свабоду?

Г. В.: Мы іх не прымушалі, але арыентавалі. Дзеці разумелі, якія перавагі дае веданне замежных моў. Мы з жонкай вучыліся ў той час, калі ўсім здавалася, што прафесія — гэта выбар на ўсё жыццё. Але нам ужо тады прыйшлося паралельна асвойваць новыя прафесіі. На Мадагаскары грунтоўна вывучаў сельскую гаспадарку, прычым даволі перадавую. У выніку працаваў перакладчыкам не толькі ў аўдыторыі, але і за штурвалам камбайна, іншай тэхнікі. Дзеці скончылі гімназіі ў той час, калі з'явілася дакладнае разуменне: каб быць паспяховым, трэба ўвесь час вучыцца, каб да асноўнай прафесіі дадаць яшчэ некалькі. А сваёй першай прафесіяй яны выбралі замежныя мовы.

С. У.: Вядома, мы іх арыентавалі, але пры гэтым прыглядаліся, што ім цікава. Перакананыся, што дзеці па сваім складзе гуманітарыі. Калі Алесь даведаўся, што ў гімназіі з паглыбленым вывучэннем замежнай мовы адкрываецца беларускамоўны клас, захацеў вучыцца менавіта ў ім. Цяпер магу сказаць, што дзеці не расчараваліся ў выбары прафесіі, якая дазваляе развівацца ў шматлікіх кірунках.

— Як у вас у сям'і падзяляюцца хатнія абавязкі?

Г. В.: У нас класічны варыянт: я адказваю за прыбытак у сям'і, на Святлане — выхаванне дзяцей і побыт. Пры гэтым жонка заўсёды працавала, таму таксама ўнесла свой уклад у дабрабыт сям'і.

— Наколькі сур'ёзна на сямейны дастатак паўплывалі замежныя камандзіроўкі?

Г. В.: Гэта быў вельмі добры стартавы капітал. За яго мы ў канчатковым рахунку пабудавалі кааператыўную кватэру, набылі аўтамабіль, здаецца, яшчэ і на мэблю хапіла.

— Якія ў вас увогуле правілы абыходжання з грашыма?

Г. В.: Гэта, хутчэй, правіла жыцця, якое адбіваецца і на стаўленні да грошай: жыць сёння і па магчымасці добра. Думаю, што так на мяне паўплываў ранні сыход мамы: сёння ў нас ёсць, а заўтра можа і не быць.

Ніколі не шкадавалі грошай на развіццё дзяцей, камфортнае жыццё, адпачынак. Імкнуліся жыць так, каб ні ў чым сабе не адмаўляць. І таму, калі ў 1991 годзе здарылася «рэформа», у нас не было назапашванняў, мы нічога не страцілі. Наша нервовая сістэма не пацярпела, чаго не скажаш, напрыклад, пра нашых знаёмых, у якіх у той час было на кніжках сорак тысяч рублёў. Яны іх усё жыццё збіралі, ва ўсім сабе адмаўлялі. Вынік: і грошы страцілі, і жыцця нармальнага не бачылі. Але як жыць — гэта іх выбар, а вось такіх бязглуздых «рэформаў» ніхто не чакаў.

Мы і цяпер не адкладваем грошы, як гаворыцца, на чорны дзень. Атрымліваецца зарабіць — выдатна. Абмяркоўваю з жонкай, колькі і на што нам трэба. Калі нешта застаецца, дзялюся з дзецьмі, але... не на шкоду сабе.

— Мы зараз знаходзімся ў вашым загарадным доме. Некалькі гадоў таму тут была аграсядзіба, якой займаўся ваш сын Алесь. Цяпер яна не працуе?

Г. У.: Так, мы сур'ёзна абмяркоўвалі з сынам гэтае пытанне і прышлі да высновы, што рацыянальна пакуль закрыць. Усё было добра да каранавіруса, да нас прыязджалі госці з замежжа, ім падабалася, што мы добра гаворым на іх мове. У нас у сям'і тры сертыфікаваныя гіды-перакладчыкі. Іншаземцы ж не ездзяць аўтобусамі па 40 чалавек, у іх невялікая кампанія або сям'я наймае гіда. Але потым турыстаў не стала. А беларусы, на жаль, яшчэ не навучыліся адпачываць дома. Для мяне дзіўна, калі чалавек ведае ўсе турэцкія курорты, а на радзіме Янкі Купалы не быў ні разу. Ну, і так склалася, што Алесю з жонкай цяпер больш зручна з-за працы быць у Мінску, а нам тут. Зрэшты, адсюль да гарадской кватэры 40 хвілін на аўтамабілі.

— Як жывецца на пенсіі?

С. У.: — Гэта цудоўны перыяд жыцця, калі нікуды не трэба спяшацца, можна займацца тым, на што раней бракавала часу. Па-ранейшаму шмат чытаю, люблю добрае кіно, балазе цяпер тэхналогіі дазваляюць глядзець, што падабаецца і калі зручна. Можна і працаваць па меры сіл.

Г. В.: — Нечакана ў сувязі з існуючымі абставінамі стала запатрабаванай адна з маіх спецыяльнасцяў, звязаная з паліграфіяй. Супрацоўнічаю з рознымі прадпрыемствамі, рэгулярна выязджаю ў камандзіроўкі. Нешта зарабляю, так што пра пенсію пакуль забыўся. Хацелася б, карыстаючыся выпадкам, сказаць вялікі дзякуй усім выкладчыкам Мінскага інстытута замежных моў (цяпер — МДЛУ), якія далі мне тры спецыяльнасці: перакладчыка, выкладчыка і ваеннага паліграфіста.

— У вашай сям'і кожны валодае некалькімі замежнымі мовамі. А на якой любіце размаўляць паміж сабой?

С. У.: — Думаю, што ў сям'і мы гаворым на мове любові і ўзаемапавагі.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

Парады спецыяліста

Падмануць Альцгеймера

Як захаваць ясны розум да глыбокай старасці і чым дапамагчы хвораму

Найбольш распаўсюджаная форма дэменцыі, якая сустракаецца ў 60 працэнтах выпадкаў, — гэта хвароба Альцгеймера. Яна выклікае пільную ўвагу з боку ўрачоў і вучоных. Распазнаць такую паталогію на ранніх этапах — значыць прадоўжыць сабе паўнавартаснае жыццё. Бо з дапамогай правільна падабранай тэрапіі можна запаволіць пагаршэнне стану чалавека. Што ж можа дапамагчы захаваць памяць у сталым узросце? Ці можна натрэніраваць мозг, як мышцы? І што рабіць, калі дэменцыя развіваецца ў вашага блізкага? Як правільна арганізаваць догляд? Пра гэта і іншае расказала загадчык аддзялення Мінскага гарадскога клінічнага цэнтра псіхіятрыі і псіхатэрапіі Ніна ЛУКАШЭВІЧ.

Дэменцыя ці старэчая няпамятлівасць?

— У аснове хваробы Альцгеймера ляжыць паступовае разбурэнне клетак і тканак галаўнога мозга, асабліва тых яго ўчасткаў, якія адказваюць за памяць і мысленне, — тлумачыць Ніна Вячаславаўна. — Сімптаматыка звычайна павольна, але няўхільна прагрэсіруе. Паступова губляюцца кагнітыўныя функцыі: памяць, разважанні, абстрактнае мысленне, матэматычныя здольнасці. Адбываецца распад эмацыянальнай сферы і асобы ў цэлым, губляюцца рухальныя навыкі і асабліва маўленчыя. Хворы перастае пазнаваць нават родных і блізкіх, ён прыкаваны да пасцелі, не можа абслугоўваць сябе. Хвароба характэрная для прадстаўнікоў усіх сацыяльных груп і не звязана з прыналежнасцю да пэўнага пласта грамадства, полу, нацыянальнасці і з пражываннем у пэўнай геаграфічнай мясцовасці. Хоць найбольш часта захворванне адзначаецца ў людзей састарэлага ўзросту, сустракаецца яно і сярод маладзейшых.

Звычайна захворванне падбіраецца непрыкметна: вызначыць пачатак і адрозніць яго ад так званай старэчай няпамятлівасці, на якую пакутуе велізарная колькасць пажылых людзей, вельмі складана. Як вядома, чалавечая памяць з узростам пачынае слабець. Гэта, на жаль, непазбежны закон прыроды. Аднак хвароба Альцгеймера — не звычайнае ўзроставае пагаршэнне памяці. Гэта невылечнае каварнае захворванне, якое разбурае чалавечую памяць поўнасцю.

Сімптомы разбурэння тканак мозга праяўляюцца даволі павольна, але яны няўхільна прагрэсуюць.

— На ранніх стадыях адзначаецца расстройства памяці, якое выяўляецца, напрыклад, у няздольнасці ўспомніць нават падзею, якая адбылася нядаўна, ці завучаную інфармацыю. З развіццём хваробы выяўляюцца такія сімптомы, як збытанасць думак, раздражняльнасць і агрэсіўнасць, ваганні настрою. Парушаецца здольнасць гаварыць і разумець сказанае. Як правіла, хвароба доўжыцца ад пяці да дзесяці гадоў. З цягам часу паступова губляюцца функцыі мыслення, разважанні, памяць. Асоба распадаецца, губляюцца маўленчыя і іншыя рухальныя навыкі. Чалавек не пазнае блізкіх і родных, не можа сябе абслугоўваць, перастае рухацца, — расказвае ўрач.

Хворы са значнымі зменамі ў псіхіцы становіцца падобны да дзіцяці. Ён не валодае дастатковым самаканторолем і крытычнасцю, каб адэкватна ацаніць сітуацыю. Чалавек у такім стане можа трапіць у небяспечнае становішча або стаць крыніцай яго ўзнікнення: учыніць пажар, уключыць газ, згубіцца на вуліцы.

Ажыццяўляць догляд пацыентаў, якія пакутуюць на хваробу Альцгеймера, часам бывае вельмі складана. У хатніх умовах догляд такіх хворых, як правіла, кладзецца на блізкіх, якія падвяргаюцца найманейшаму эмацыянальнаму стрэсу, пастаянна назіраючы за тым, як дэградуе любімы чалавек. Непадрыхтаванасць і бездапаможнасць сваякоў у сітуацыі хранічнага стрэсу не толькі не дапамогуць хвораму, але і могуць адбіцца на стане іх уласнага здароўя.

Сваякам і тым, хто ўдзельнічае ў доглядзе, важна валодаць простымі практычнымі прыёмамі. Часам трэба знаходзіцца каля хворага даволі працяглы перыяд, які можа доўжыцца гадамі. Гэта патрабуе вялікага цярпення, маральных і фізічных сіл, бо хворага трэба мыць, сядзець каля яго, сачыць, каб ён не здзяйсняў дурасці, падтрымліваць з ім гутарку на самыя розныя тэмы. Апроч таго, узнікае вялікая колькасць дадатковых праблем, напрыклад: хворы дрэнна спіць, блукае па начах, трызніць, часам агрэсіўна паводзіць сябе.

Што важна ведаць падчас догляду?

Рэжым дня. У першую чаргу неабходна ўстанавіць пэўны рэжым дня для хворага, што дазволіць арганізаваць і ўпарадкаваць яго жыццё. Рэжым павінен уключаць звыклыя заняткі, гэта дапаможа асобе захаваць адчуванне ўпэўненасці і абароненасці.

Неабходна зрабіць так, каб у пажылога была магчымасць займацца любімымі справамі — усімі сіламі падтрымлівайце яго цікавасць да іх. Пры гэтым па магчымасці неабходна выключыць з жыцця стрэсавыя сітуацыі, не выклікаць агрэсію і гнеў.

Станоўчыя эмоцыі. Важна паспрабаваць дапамагчы чалавеку захаваць пачуццё ўласнай годнасці. У яго прысутнасці варта ўстрымлівацца ад абмеркавання яго стану, бо словы і ўчынкі навакольных могуць выклікаць турботу і крыўду.

Недапушчальна прыцягваць увагу да няўдач. Любы канфлікт прыводзіць да непатрэбнага стрэсу як для хворага, так і для людзей, якія яго даглядаюць. Праявы гневу, жорсткасці ці крыўды толькі пагоршаць сітуацыю і ўзмоцняць праблему. Спрабуйце захоўваць спакой, імкніцеся смяяцца разам (але не з хворага). Гумар часта бывае выдатным сродкам ад стрэсу.

Фізічная форма. Фізічныя практыкаванні дазваляюць на некаторы час падтрымаць функцыянальныя здольнасці, але па рэкамендацыі аб характары і складанасці практыкаванняў лепш усё ж звярнуцца да спецыялістаў. Калі да хваробы чалавек любіў працаваць у садзе або на агародзе, яму можа падарыць задавальненне выкарыстанне навыкаў, якія захаваліся. Аднак нельга забываць, што па меры прагрэсіравання захворвання здольнасці і інтарэсы могуць мяняцца.

Хвароба Альцгеймера — гэта не звычайнае ўзроставае пагаршэнне памяці. Гэта невылечнае каварнае захворванне, якое разбурае чалавечую памяць поўнасцю.

Зносіны. З развіццём хваробы яны паміж хворым і тым, хто яго даглядае, могуць усё больш ускладняцца. Варта праверыць зрок і слых у пацыента, пры неабходнасці замовіць мацнейшыя акуляры, замяніць слыхавы апарат. Як мага больш майце зносін з пажылым чалавекам, пры гэтым гаворка павінна быць выразная, павольная, прапановы — простыя, кароткія. Выкарыстайце невербальныя сродкі зносін: пагладжванні, дакрананні. Пачынаючы размову, дакраніцеся да хворага, звярніце яго ўвагу на сябе.

Пры зносінах рэкамендуюць паважліва звяртацца да хворага па імені (імені па бацьку); гаварыць выразна, павольна, твар у твар з хворым, пры гэтым трымаць галаву на ўзроўні яго вачэй; праяўляць душэўную цеплыню, абдымаючы хворага, калі гэта яго не абмяжоўвае; уважліва выслухоўваць; паспрабаваць вызначыць жэсты і спалучэнні слоў, словы-падказкі, неабходныя для эфектыўнага падтрымання зносін; пазбягаць негатыўнай крытыкі, спрэчак, канфліктаў.

Агрэсіўныя паводзіны. Сур'ёзным выпрабаваннем для чалавека, які ажыццяўляе догляд хворага з хваробай Альцгеймера, з'яўляюцца агрэсіўныя паводзіны пацыента. Пры ўзнікненні агрэсіі важна захоўваць спакой і ні ў якім разе не адказваць тым жа. Трэба імкнуцца гаварыць з хворым спакойна, прыязна і трымацца ад яго на некаторай адлегласці, таму што блізкае знаходжанне пацыент успрымае як патэнцыяльную пагрозу. Па магчымасці пераключыце яго ўвагу на спакойны занятак.

Пры з'яўленні вар'яцкіх ідэй ці рознага кшталту галюцынацый не спрабуйце спрачацца, бо неабходнасць абараняць уласныя погляды здольная прывесці хворага да ўзмацнення трызнення. Можна паспрабаваць адцягнуць яго ўвагу на рэальны аб'ект і пазней пракансультавацца з урачом: магчыма, галюцынацыі выкліканыя ўжываннем якога-небудзь прэпарата.

Меры бяспекі. Пакладзіце ў кішэні адзення хворага запіску з яго імем, хатнім адрасам і нумарамі тэлефонаў, па якіх можна звязацца са сваякамі. Абсталёўвайце дзверы кватэры складанымі замкамі так, каб пажылы чалавек не меў магчымасці выйсці з кватэры самастойна. Карысна прымацаваць на ўсе дзверы люстэркі — гэта здольна адцягнуць хворага ад жадання адчыніць дзверы.

Страта адэкватнага ўспрымання навакольнага асяроддзя і каардынацыі руху можа прывесці да атрымання бытавых траўмаў. Для таго каб засцерагчы хворага, неабходна перакрыць газ і ваду, калі такі чалавек застаецца адзін, устанавіць замкі на вокнах, вывесці яго доступ да вострых, ржавых і колючых прадметаў, небяспечных інструментаў, электрычных прыбораў, лекавых сродкаў, хімічных і вогненебяспечных рэчываў, запалак. Ванны пакой і прыбіральню варта абсталяваць поручнямі, насадкамі на ўнітаз і нясліжкімі дывянкамі, а яго пакой — устойлівай мэбляй. Пры гэтым пажадана не мяняць звыклага размяшчэння мэблі.

Хворы са значнымі зменамі ў псіхіцы становіцца падобны да дзіцяці. Ён не валодае дастатковым самаканторолем і крытычнасцю, каб адэкватна ацаніць сітуацыю.

Асабістая гігіена. Нагадвайце хворому аб неабходнасці мыцця, дапамагайце карэктна, захоўваючы такт і паважаючы яго асабістую годнасць. Для бяспекі хворага максімальна выкарыстоўвайце разнастайныя сродкі рэабілітацыі: прыступкі для ванны, спецыяльныя крэслы, разнастайныя поручні, нясліжкія дывянкі.

Пры хваробе Альцгеймера чалавек можа ўпадаць у стан, у якім ён забывае, дзе знаходзіцца прыбіральня, перастае адчуваць, калі варта туды пайсці. Важна пры гэтым максімальна заахвочваць хворага ў наведванні прыбіральні, устанавіўшы пэўны рэжым. Для напаміну аб тым, дзе ён знаходзіцца, можна пакідаць дзверы адчыненымі ці пазначаць іх вялікімі каляровымі літарамі. Уначы можна выкарыстоўваць санітарнае крэсла або памперсы.

Адзяванне. Хворы можа забыцца на працэдуру адзявання, не бачыць неабходнасці ў змене адзення. Дапамагаючы хвораму, яго адзенне варта пакласці ў патрэбным парадку, у якім ён будзе яго выкарыстоўваць. Лепш пазбягаць адзення са складанымі гузікамі, падыдуць ліпучкі і гумкі. Абутак мусіць быць зручным, нясліжкім, на гумовай падэшве, свабодным, але не звальвацца з нагі. У працэсе адзявання не прыспешвайце хворага, хай ён робіць гэта павольна, але самастойна.

Прыём ежы. Калі хворы есць самастойна, то задача таго, хто даглядае, — проста нагадаць яму аб неабходнасці прыёму ежы, разагрэць яе і падаць на стол. На позніх стадыях хваробы Альцгеймера хворага ўжо давядзецца карміць. Ежа пры гэтым мусіць быць у выглядзе пюрэ ці ў вадкім стане. Падавайце ежу толькі цёплай, бо ў хворага часам знікае адчуванне гарачага і халоднага.

Як падоўжыць працаздольнасць мозга?

Каму хочацца бачыць сваю або старасць сваіх блізкіх вар'яцкай, бездапаможнай, бяспамятнай? Тады не запускайце работу шэрых клетак. Для гэтага ўрач раіць замяніць каву (асабліва па раніцах) зялёным чаем. Ён пашырае крывяносныя сасуды мозга, умацоўвае іх сценкі. Акрамя таго, важна не дапускаць бяссонніцы. Сон вяртае здольнасць мозга ўспамінаць. Палепшыць яго кровазабеспячэнне дапамагаюць фізічныя практыкаванні і прагулкі на свежым паветры.

Адначасова ўсяляк практыкуйце сваю памяць: разгадвайце крыжаванкі, больш чытайце, вядзіце дзённікі, завучвайце на памяць вершы, асвойвайце новую бытавую тэхніку. Тое, што трэніруецца, тое і падтрымліваецца, а тое, што не працуе, — памірае. Гэты прынцып дакладны і для мозга, асабліва ў пажылым узросце. Вядома, наўрад ці нейроны можна накачаць, нібы біцэпсы, і, нават усяляк падтрымліваючы сваю памяць у добрым стане, пажылы чалавек не зможа спыніць старэнне мозга, але, тым не менш, вынік ад трэніровак ёсць.

А да правалаў у памяці стаўцеся з гумарам. Напрыклад, як гэта рабіла Фаіна Ранеўская: «Склероз нельга вылечыць, але пра яго можна забыцца». Памятайце, што любыя перажыванні толькі пагаршаюць памяць.

Алена КРАВЕЦ.

БЫЛО ВАША, СТАЛА НАША

Чаму дзіця цягне чужое і што з гэтым рабіць

Дзіцячыя крадзяжы адносяцца да «саромных» пытанняў, якія бацькі імкнуцца вырашаць у сямейным асяроддзі. І звяртаюцца па псіхалагічную дапамогу толькі тады, калі праблема набывае пэўны маштаб ды становіцца відавочна, што замоўчваць яе далей немагчыма.

Таму прычыны і спосабы папярэджання дзіцячых крадзяжоў пакуль вывучаны ў значна меншай ступені, чым іншыя паводзінскія праблемы дзяцей — аб гэтым кажуць самі псіхолагі. Менш за ўсё даследаванняў па дадзенай праблеме датычыцца малых з поўных сем'яў: быццам «камплект» клапатлівых бацькоў, маецца павага адзін да аднаго, а таксама дабрабыт... Зразумела, сутыкнуўшыся з праблемай дзіцячага крадзяжу, бацькі да апошняга «не выносяць смецце з хаты» і, як падкрэсліваюць спецыялісты, часцей за ўсё здзяйсняюць мноства выхаваўчых памылак. Паколькі не ўсведамляюць сапраўдных вытокаў такіх паводзін сына ці дачкі.

Ці ёсць прычыны хвалявацца?

Як правіла, першае пытанне дзіцячага псіхолага, да якога звярнуліся з такой праблемай, будзе аб узросце дзіцяці. Да чатырох, а часам нават да пяці гадоў малы не ўмее дакладна падзяляць навакольныя прадметы на «свае» і «чужыя». І, адпаведна, прысвоіўшы чужы шуфлік у пясочніцы, сцягнуўшы цукерку са стэлажа ў краме або захапіўшы з садка «грамадскую» цацку, у душы звычайна не ацэньвае свой учынак са знакам «мінус». І да згрызот сумлення заклікаць у дадзеным выпадку рана. Псіхолагі адзначаюць, што ўтрымаць малечу ад жадання ўзяць тое, што спадабалася, можа страх пакарання, а не маральныя нормы. Але кораць малога ў такой сітуацыі якраз не варта. Бацькам дастаткова ў простай і даступнай форме растлумачыць такое абстрактнае паняцце «ўласнасць», распавесці, як пераживае той, чыя рэч знікла, і прапанаваць спраецыраваць сітуацыю на сябе: што б ты адчуваў, калі б у цябе знікла любімая цацка?..

Яшчэ адна прычына дзіцячага крадзяжу, якая расце з таго ж кораня, — «крык душы» дзіцяці. У гэтым выпадку крадзеж паказны, зроблены ім у разліку прыцягнуць да сябе ўвагу бацькоў.

З шасцігадовага ўзросту дзіця ўжо ў стане зразумець, што красці — дрэнна. І механізм крадзяжу тут іншы. Гэта моцнае жаданне валодаць чымсьці, якому маленькі чалавек не змог супрацьстаяць. Уласна, крадзяжы па прычыне «не змог устаяць перад спакусай» здзяйсняюць часам нават падлеткі. Псіхолагі супакойваюць, што, як правіла, гэта разавы «збой», і такім крадзяжам не ўласціва мець паўторы і працяг. Асаблівасці, якія можна назваць у згаданым выпадку: дзіця разумее, што паступае дрэнна і амаральна, як і тое, што яго дзеянні нанеслі шкоду іншым. Але паколькі спакуса занадта вялікая, яно шукае і знаходзіць сабе апраўданні. У такой сітуацыі псіхолагі раяць бацькам настаяць на тым, каб дзіця само (а не мама або тата) вярнула ўкрадзенае ўладальніку і папрасіла прабачэння. Пажадана — не пад ціскам бацькоў, а з прычыны іх здольнасці перакананаць маленькага чалавека. Неабавязкова вяртанне павінна адбыцца пры сведках, можна зрабіць так, каб ніхто са старонніх таго не бачыў.

Нават калі вам здаецца, што маральныя нормы малое павінна ўвабраць з самога ўкладу жыцця вашай нармальнай, законапаслухмянай і поўнай сям'і, варта, пакуль малы не вырас, усё ж час ад часу выдаткоўваць некалькі хвілін на гутаркі і тлумачэнні на тэму «сваё — чужое».

У восем-дзесяць гадоў дзіця ўжо выдатна ўсведамляе, што такое добра і што такое дрэнна. І крадзеж, як правіла, суправаджаецца пачуццём сораму, дзіця адмаўляе сваю правіну і не прызнаецца да апошняга. Яно разумее, што крадзеж можа стаць прычынай разладу ў адносінах з блізкімі (бацькамі і сваякамі). З іншага боку, гадоў з 10—12 усё больш значнымі для дзіцяці паступова становяцца аднагодкі. І прычынай крадзяжу можа стаць як жаданне даказаць сваю «крутасць», імкненне заняць высокае месца ў дзіцячай іерархіі (калі дваровая кампанія падабралася адпаведная), так і зайздрасць і нелюбоў да некага з равеснікаў — напрыклад, сярод аднакласнікаў. Зрэшты, не ўсе дзеці развіваюцца адналькава, і праблемы з самакантролем могуць заставацца і ў такім узросце (тады матывам крадзяжу можа быць той, што апісаны ранней, — немагчымасць супрацьстаяць спакусе). І тут бацькам важна не ўпадаць у паніку, а памятаць, што праблемы з самакантролем звычайна перарастаюцца.

А вось у падлеткавым узросце крадзеж — той крок, які ўсведамляецца цалкам: і маральны бок, і наступствы. Аднак не варта забываць, што дзіця перажывае пераходны ўзрост — як пішуць псіхолагі, самы цяжкі ў жыцці любога чалавека крызіс (уявіце сабе, нават славуты «крызіс сярэдняга ўзросту» не ідзе ні ў якое параўнанне з пубертатам). Магутная гарманальная перабудова, імклівы рост усіх органаў і сістэм плюс сімптомы, якія ў дарослым узросце псіхалогія кваліфікуе як наймацнейшы стрэс, а ў падлеткавым — лічыць усяго толькі «праблемамі росту». Дадзім да гэтага непазбежны пошук свайго месца ў свеце і грамадстве. Словам, перш чым упадаць у істэрыку, бацькам варта разабрацца, у чым матыў і дзе вытокі ўчынку дзіцяці. А ў цэлым, як пішуць даследчыкі тэмы, прычын ужо ўсвядомленага дзіцячага крадзяжу не так і шмат — педагагічныя памылкі ў сям'і (халоднасць, жорсткі, загадны стыль выхавання або іншая крайнасць — гіперапека і ўсёдазволенасць), імкненне даказаць смеласць аднагодкам або прыцягнуць да сябе ўвагу бацькоў...

Каля вытокаў крадзяжу можа быць дзіцячая траўма. Напрыклад, дзіця, калі было зусім маленькае, ужо здзяйсняла такі ўчынак, і бацькі вельмі жорстка і ў зневажальнай форме «раз і назаўжды» вырашылі праблему. Наступствам такога «вырашэння» цалкам могуць стаць усвядомленыя крадзяжы ўжо ў падлеткавым узросце. У цэлым, як пішуць псіхолагі, вельмі часта ў «анамнезе» дзяцей, што крадуць, можна знайсці нейкую падзею, якая траўміравала, або складаныя абставіны ў сям'і.

Існуе яшчэ адна прычына — клептаманія, досыць рэдкая з'ява, для якой характэрна паталагічнае імкненне да крадзяжу. Тут наогул не важны аб'ект выкрадання — важны працэс. Украдзеная ж рэч для чалавека каштоўнасці не мае — ён лёгка можа яе зламаць або выкінуць. І такую праблему вырашаць трэба ўжо не з псіхолагам, а з псіхіятрам.

Не навошта, а чаму

Як ужо гаварылася, з праблемай дзіцячага крадзяжу досыць рэдка звяртаюцца да псіхолагаў бацькі са шчаслівых сем'яў. Між тым праблема гэтая досыць распаўсюджаная, і з ёй у сваёй практыцы сутыкаюцца многія педагогі, калі яны працуюць у школе дастаткова доўга. Вось дзве праўдзівыя гісторыі.

У поўнай сям'і, акружаныя любоўю і клопатам (як здавалася бацькам), раслі старэйшы сын і малодшая дачка (яна маладзейшая за брата на тры гады). Дзесяцігадовы сын пачаў красці цацкі, рэчы, навучальныя прылады і наогул усё, што «дрэнна ляжала», у сястры-першаклашкі. Адкрылася гэта не адразу — некалькі разоў дзяўчынку нават павыхоўвалі за страчаныя рэчы (якія на самай справе скраў у яе брат, як высветлілася пазней). Так працягвалася, пакуль праўда не стала відавочнай.

Рэчы гэтыя хлопчыку былі непатрэбныя — ён выкідваў або хаваў іх. Проста ў досыць раннім узросце сыну паведамілі, што ён «ужо вялікі» (бо ў сям'і ёсць малодшая), і пачалі ставіцца да яго адпаведна. І дзіця прывыкла лічыць, што яго «не любяць». Плюс традыцыйная для нашай культуры розніца ў выхаванні сына і дачкі — гэта таксама адыграла сваю ролю. Такім чынам, вытокамі крадзяжу сталі эмацыянальная халоднасць бацькоў, імкненне прыцягнуць іх увагу і жаданне адпомсціць «шчаслівай сапернічы». Звярнуліся да псіхолага бацькі толькі пасля таго, як крадзяжы сына выйшлі за межы сям'і — ён паспрабаваў сцягнуць цацку ў краме і быў злоўлены.

У трэцім класе дзеці сталі «недалічвацца» асабістых рэчаў — прыгожых ручак, гумак, часам «знікалі» пеналы. Знаходзіліся згубы ў заплечніку хлопчыка, які сам даставаў адтуль гэтыя рэчы і выглядаў збянтэжаным, што яны ў яго. Хлопчык не вылучаўся прыкладным паводзінамі, але ў класе з ім сябравалі многія. Здзяйсняў ён гэтыя крадзяжы ці не, настаўніца не магла зразумець і, паколькі была вопытным, дасведчаным педагогам, не спяшалася з абвінавачваннямі. Бо калі дзіця сцвярджала, што не ведае, як чужыя рэчы трапілі ў яго заплечнік, яно выглядала шчырым. І педагог мела рацыю. Аднойчы яна ўбачыла, як дзяўчынка, вызваленая ад фізкультуры, застаўшыся ў класе адна, дастае рэчы з сумак аднакласнікаў і хавае ў заплечнік гэтага хлопчыка.

Дзяўчынка тая была самай малодшай у класе — яна пайшла ў школу на год раней. І аказалася, што гэта было памылкай. Ёй было складана спраўляцца з вучобай, а аднакласнікі з ёй не сябравалі. Хлопчык жа, якому яна вырашыла такім чынам адпомсціць, па-першае, быў папулярны ў аднагодкаў, а па-другое, дражніў яе «малой» і пастаянна пасміхаўся з яе.

Абедзве гісторыі — не пра крадзяжы. Яны — пра дзіцячую адзіноту, трывожнасць і неабароненасць. Нізкая самаацэнка, недахоп бацькоўскай падтрымкі часта штурхаюць дзяцей на крадзеж, адзначаюць псіхолагі. У больш старэйшым узросце прычынай крадзяжу, як ужо гаварылася, можа стаць пошук павагі аднагодкаў. А калі дома дзіця не чуюць, не даюць яму цяпла і любові, яно шукае ўсё гэта па-за межамі сям'і. І верагоднасць трапіць у «дрэнную кампанію» ўзрастае, а значыць, у далейшым праблема можа толькі пагаршацца (замест таго, каб пры разумным падыходзе дарослых стаць разавым эпізодам). Бо на абарону і разуменне ад мамы і таты такое дзіця не разлічвае. Яшчэ адна прычына дзіцячага крадзяжу, якая расце з таго ж кораня, — «крык душы» дзіцяці. У гэтым выпадку крадзеж паказны, зроблена ім у разліку прыцягнуць да сябе ўвагу бацькоў. Дэманстрацыя сваёй нязгоды з усталяванымі імі правіламі. То-бок дзіця крадзе, разлічваючы быць злоўленым.

Бацькам дастаткова ў простай і даступнай форме растлумачыць такое абстрактнае паняцце «ўласнасць», распавесці, як перажывае той, чыя рэч знікла, і прапанаваць спраецыраваць сітуацыю на сябе.

Зрэшты, часам прычынай можа быць і банальны недахоп жыццёвага вопыту («не падумаў»), інфантыльнасць, адсутнасць дакладных маральных рамак і нормаў, устаноўленых бацькамі. Дапусцім, дзіця ўпотай бярэ з мамінага кашалька грошы, каб купіць... падарунак маме. Зрабіць сюрпрыз. Бо калі сказаць, што ўзяў грошы і на што яны патрэбныя, — гэта ўжо не будзе сюрпрызам. У сваё апраўданне дзіця кажа, што мама ж таксама часам бярэ грошы ў таты ў кашальку — чаму я не магу зрабіць тое ж самае?.. Нават калі вам здаецца, што маральныя нормы малое павінна ўвабраць з самога ўкладу жыцця вашай нармальнай, законапаслухмянай і поўнай сям'і, варта, пакуль малы не вырас, усё ж час ад часу выдаткоўваць некалькі хвілін на гутаркі і тлумачэнні на тэму «сваё — чужое». Аб тым, чаму амаральна браць чужое, аб павазе да чужой уласнасці. А таксама пра тое, чаму не варта прысвойваць знойдзены на вуліцы кашалёк або тэлефон, а варта паспрабаваць знайсці ўладальніка.

Дзіяна РОНІНА.

Што рабіць?

Але як быць, калі факт, як кажуць, ужо ў наяўнасці: дзіця крадзе? Перш за ўсё не ўпадаць у паніку, раяць дзіцячыя псіхолагі. Існуе верагоднасць, што справа вырашыцца адной сур'ёзнай, спакойнай гутаркай.

• Спачатку паспрабуйце зразумець сапраўдную прычыну такога ўчынку. «Разбірацца» трэба менавіта з ёй, а не з дзіцем. І, магчыма, з дапамогай псіхолага.

• Будуйце гутарку ў залежнасці ад таго, як дзіця рэагуе на зробленае. Калі раскайваецца і яму сорамна (і асабліва калі малы або падлетак сам распавёў пра свой учынак) — гэта адно, і зусім іншае, калі раскаяння вы не бачыце. У другім выпадку важна пастарацца абудзіць у ім сумленне, падрабязна пагаварыўшы пра тое, чаму красці — недапушчальна і амаральна.

• Але вось чаго дакладна рабіць нельга — гэта «навешваць ярлыкі» і «ставіць штампы». Не называйце дзіця злачынцам, не абяцайце «здаць яго ў міліцыю» і не малюйце змрочныя перспектывы яго «крымінальнай будучыні». Ацэньвайце негатыўна яго ўчынак, але не яго самога. Сын ці дачка павінны разумець, што іх па-ранейшаму любяць, а асуджаюць толькі ўчынак. Які можна выправіць і больш не здзяйсняць.

• Выправіць учынак дзіця павінна само. Не вяртайце скрадзенае за яго, бо чалавек павінен разумець: любое дзеянне мае наступствы.

• Калі высвятляецца, што ў наяўнасці канфлікт з аднагодкамі як першапрычына — устаньце на бок дзіцяці. Калі справа ў дрэннай кампаніі — засяродзьцеся на гэтай праблеме і дапамажыце сыну або дачцэ развітацца з ёю. Галоўнае — падарыце свайму дзіцяці адчуванне абароненасці, умацуйце яго веру ў сябе. І тады гэты непрыемны эпізод назаўсёды застанецца ў мінулым.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества унитарного предприятия «Вилейское СМУ ОАО «Минскводстрой»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Принтер HP laserJet 1320, 1 шт.; Монитор ViewSonic VX2450WM-LED, 1 шт.; клавиатура Logitech, 1 шт.; монитор ViewSonic, 1 шт.; принтер Xerox Phaser 3150, 1 шт.	353,16	35,32	17,66
2	Труба круглая 426х22, 7 м	1209,60	120,96	60,48
3	МФУ CANON IR 2520 инсталлир. с двусторонним податчиком оригиналов AB1 3796B003, инв. № 202	1296,00	129,60	64,80
4	Компрессор винтовой CSD 85T8.5 бар 400/50EU, инв. № 187	36180,00	3618,00	1809,00
5	Станок токарно-винторезный РТ-21002, инв. № 200	5400,00	540,00	270,00
6	Станок 1В62Г, инв. № 232	5184,00	518,40	259,20
7	Пресс гидравлич. ОКС 1671 м, инв. № 237	3780,00	378,00	189,00
8	Станок токарно-винторезный 16К20 б/у, инв. № 234	4752,00	475,20	237,60
9	Стрела крановая 1560-4629000, инв. № 164	840,00	84,00	42,00
10	Ножницы комб., инв. № 50	2160,00	216,00	108,00
11	Персональный компьютер, инв. № 157	15,60	1,56	0,78
12	МФУ CANON IR 2520 инсталлир. с двусторонним податчиком оригиналов AB1 3796B003, инв. № 202	1440,00	144,00	72,00
13	Блок-контейнер, инв. № 75	1920,00	192,00	96,00
14	Блок-контейнер, инв. № 76	1920,00	192,00	96,00
15	Вибротрамбовка PH70H, инв. № 195	2040,00	204,00	102,00
16	Мотопомпа бензиновая высоконапорная SERM50VBAA, инв. № 143	876,00	87,60	43,80
17	Мотопомпа бензиновая высоконапорная SERM50VBAA, инв. № 206	876,00	87,60	43,80
18	Машина сверлильная на э/м основании МС8+, инв. № 183	384,00	38,40	19,20
19	Автомобиль ГАЗ-32213-408 сл. кузов, инв. № VIL00208	3720,00	372,00	186,00
20	Инструменталка, инв. № 109	1020,00	102,00	51,00
21	Автомобиль Iveco EuroStar, инв. № 61	14160,00	1416,00	708,00
22	Трансформатор ТДМ-403, инв. № 93	102,00	10,20	5,10
23	Автомобиль ГАЗ 32213-414, инв. № 62	1200,00	120,00	60,00
24	Инструменталка, инв. № 116	1020,00	102,00	51,00
25	Бензопила «Штиль» MS 250(без цепи и шины), инв. № 186	360,00	36,00	18,00
26	Компрессор винтовой CSD 85T8.5 бар 400/50EU, инв. № 187	38760,00	3876,00	1938,00
27	Станок ток-винт РТ-21002, инв. № 200	6360,00	636,00	318,00
28	Инструменталка, инв. № 126	1020,00	102,00	51,00
29	Полуавтомат для сварки инверторный MIG500A/MMA, инв. № 203	1800,00	180,00	90,00
30	Автомобиль ГАЗ 32213-244 X96322130D0762983, инв. № 197	4920,00	492,00	246,00
31	Холодильник МХМ-2808-90. сер-т BY/112 03/06/002, инв. № 139	264,00	26,40	13,20
32	Бензорез STIHL TS420 350 мм, инв. № 166	648,00	64,80	32,40
33	Сварочный бензиновый генератор WAGT 220DC HCB, инв. № 130	528,00	52,80	26,40
34	Трансформатор свар. ТДМ252 (380В, плав. регул. 50-250А), инв. № 121	192,00	19,20	9,60
35	Станок гор-фрез 6М82Г, инв. № 230	3480,00	348,00	174,00
36	Станок ток-винт 1В62Г, инв. № 231	5160,00	516,00	258,00
37	Станок 1В62Г, инв. № 232	5160,00	516,00	258,00
38	Станок верт-сверл 2Н135, инв. № 233	3960,00	396,00	198,00
39	Выпрямитель ВДГ-303, инв. № 81	216,00	21,60	10,80
40	Станок попер.-стр. 7Б35, инв. № 236	2760,00	276,00	138,00
41	Пресс гидравлич. ОКС 1671м, инв. № 237	2520,00	252,00	126,00
42	Сканер CANON 400 2996C010, инв. № 218	360,00	36,00	18,00
43	Станок ББ-801, инв. № 24	3600,00	360,00	180,00
44	Ножницы НБ-318, инв. № 243	3480,00	348,00	174,00
45	Электроталь ТЭ-100-51120-01, инв. № 85	768,00	76,80	38,40
46	Настольно-сверлильный станок 2М112, инв. № 244	840,00	84,00	42,00
47	Агрегат сварочный (САК), инв. № 103	1800,00	180,00	90,00
48	Монитор ЖКИ, инв. № 70	36,00	3,60	1,80
49	Сварочный полуавтомат ПДГ-354, инв. № 115	840,00	84,00	42,00
50	Окрасочный агрегат 650 на колесиках со шлангом 3/8, поводок 1/4 и держателем XHD, инв. № 216	1440,00	144,00	72,00
51	Безвоздушный окрасочный аппарат IMPAKT 595, инв. № 215	372,00	37,20	18,60
52	Многофункциональное устройство CANON MF-4450, инв. № 152	180,00	18,00	9,00
53	Монитор LCD Philips, инв. № 100	36,00	3,60	1,80
54	Принтер Phaser 3150, инв. № 79	79,20	7,92	3,96
55	Молоток электр. Makita HM1801 (1900 Вт/63 Дж. 30 кг, хв. 6), инв. № 144	924,00	92,40	46,20
56	Сварочный генератор WAGT 220DC HSB, инв. № 140	708,00	70,80	35,40
57	Персональный компьютер, инв. № 165	15,60	1,56	0,78
58	WK330EA Ноутбук HP Probook 4520s i333M 15 4GB/500, инв. № 149	192,00	19,20	9,60
59	Компьютер без монитора, инв. № 88	15,60	1,56	0,78
60	Станок токарно-винторезный 16К20 б/у, инв. № 234	5160,00	516,00	258,00
61	Монитор ЖК, инв. № 89	36,00	3,60	1,80
62	Под. мех. ПДГ-312, инв. № 43	204,00	20,40	10,20
63	Выпрямитель ВДГ303-3, инв. № 44	216,00	21,60	10,80
64	Кунг К-375 № 01115, инв. № 128	1056,00	105,60	52,80
65	Сварочный трансформатор ТДМ-405(380В,АІ) № BY/112 03, инв. № 136	63,60	6,36	3,18
66	Станок обдир-шлифов, инв. № 482	600,00	60,00	30,00
67	Вилы грузовые 1560-4605200, инв. № 163	504,00	50,40	25,20
68	Компрессор 400 л/мин, 2,2 кВт, 50 л, 10 бар, 2 поршня, ременной, масляный, 57 кг 220В K2065Z/50 KIRK, инв. № 211	204,00	20,40	10,20
69	Автомобиль ГАЗ-32213, инв. № 48	4920,00	492,00	246,00
70	Ковш 1565-4605100 (1,1 м³), инв. № 162	756,00	75,60	37,80
71	Монитор LCD Philips, инв. № 99	36,00	3,60	1,80
72	Автомоб. кран гидравл., г/п 28 тонн «Силач» КТА-28 с, инв. № 96	59880,00	5988,00	2994,00

В отношении лотов №№ 1–8 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.**
Ранее публикация о торгах размещалась в газете «Звязда» № 252 (29874) от 23.12.2022, стр. 14.
В отношении лотов №№ 9–72 проводятся первые торги

Местонахождение лотов №№ 1–71:
222410, Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, ул. 1 Мая, д. 97б.
Местонахождение лота № 72: Минская область, Смолевичский район, д. Перемежное

Дата и время проведения торгов	**В отношении лотов №№ 1–8:** **15 февраля 2023 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55)** **В отношении лотов №№ 9–72: 7 марта 2023 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф.1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**В отношении лотов №№ 1–8:** **с 10.00 2 февраля 2023 года до 16.00 13 февраля 2023 года** **В отношении лотов №№ 9–72:** **с 10.00 2 февраля 2023 года до 16.00 3 марта 2023 года**

Условия для участия в торгах:

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901, задаток для участия в торгах по Лоту __, Унитарное предприятие «Вилейское СМУ ОАО «Минскводстрой», проводимых __.__.2023.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **– Челав, +375299999112.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

Информация о продавце	**Унитарное предприятие «Вилейское СМУ ОАО «Минскводстрой», в лице ликвидатора – ООО «Центр антикризисных проектов», тел.: 80172552928; +375293489225 (222410, Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. 1 Мая, д. 97б)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении третьих повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «МИРАН-ПАРФЮМ»

(УНП 100008993, г. Минск, ул. Бабушкина, д. 22, комн. 5),

находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов*: 16 февраля 2023 года.** Начало – 12.00.

Заявки принимаются с 02 февраля 2023 года по 15 февраля 2023 года.

Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «МИРАН-ПАРФЮМ» (УНП 100008993)** в лице антикризисного управляющего – директора ООО «Деловой консалтинговый центр» Е.А. Поповой.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайтах: http://bankrot.gov.by и http://www.specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 185 (29807) за 21.09.2022.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 224 (29846) за 15.11.2022.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 254 (29876) за 27.12.2022

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОГОЙСКИМ СЕЛЬСКИМ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫМ КОМИТЕТОМ (организатор аукциона) по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь (га)	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена (бел. рублей)	Размер задатка (бел. рублей)	Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей)
1	д. Августово, ул. Колхозная, 19А, кадастровый номер 623284600201000330	0,1208	газификация, электрификация, водоснабжение	18 000,00	1800,00	2180,02 + расходы за размещение объявления
2	аг. Гостиловичи, ул. Весенняя, 5, кадастровый номер 623284601601000381	0,1207	газификация, электрификация, водоснабжение	23 000,00	2300,00	2053,81 + расходы за размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона:
9 марта 2023 г. в 10.00
по адресу: Логойский район, г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, Логойский сельский исполнительный комитет, контактные тел.: (801774) 28473, (8029) 1779511.
Прием документов по 03.03.2023 включительно.
Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах:

Государственный комитет по имуществу:
https://au.nca.by,
Минский областной исполнительный комитет:
http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/
Логойский районный исполнительный комитет:
http://www.logoysk.gov.by/

УНП 600537220

Повторный открытый аукцион № 09/22 по продаже административного здания в Бобруйске

Организатор аукциона: ООО «Реалконсалтинг», ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8, г. Минск, 220015, РБ, тел. +375 (17) 256-61-35. Продавец – Малец В.А.

Аукцион состоится 16.03.2023 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, п. 701

Лот № 1: капитальное строение с инв. № 710/С-54549, общей площадью 2263,0 кв. м, наименование – административное здание, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности – с подвалом, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, пер. Тимирязева, д. 5 на земельном участке с кадастровым № 741000000007002233, площадью 0,1947 га.
Начальная цена продажи лота – 40 000 бел. руб. (НДС нет), сумма задатка – 100 бел. руб.

Порядок проведения и выбора победителя: победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия. Шаг аукциона – 5 % от начальной стоимости

Прием заявлений: заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8.
Последний день приема заявлений и внесения задатка: 13.03.2023 до 17.00

Задаток: для участия в аукционе необходимо внести задаток в вышеуказанном размере. Банковские реквизиты:
- для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22;
- для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБРБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22.
Получатель: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068. Назначение: «Задаток согласно Извещению о проведении повторного аукциона № 09/22»

Затраты и вознаграждение: возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения повторного аукциона № 09/22. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на расчетный счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона и причитающееся Организатору вознаграждение в размере 5 % (пяти процентов) от конечной цены продажи лота в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона. Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

Контакты: +375 (17) 256-61-35 • +375 (25) 549-86-22; auction@expertiza.by, http://www.expertiza.by
Извещение об аукционе № 09/22 опубликовано в газете «Звязда» от 09.12.2022

ООО «Аукцион Сервис» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, принадлежащего ООО «Экспресс-СВ» (ул. Севастопольская, 39А, г. Гомель, 246021, тел. +375 (29) 387-67-57)

Лот №	Наименование имущества	Начальная цена лота без НДС, руб.	Задаток 10 %, руб.	Шаг аукциона 5 %, руб.
1	2	3	4	5
1	Автомобиль МАЗ 5440 421 031, грузовой седельный тягач, г. в. 2011, белого цвета, тип двигателя – дизельный, объем двигателя – 11946 см³, № КУЗОВА Y3M544019B0000238	14 500,00	1 450,00	725,00

Срок подачи заявления на участие в аукционе	Заявление принимается с момента выхода настоящего объявления до **16.00 10.02.2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5, к. 2
Дата, время, место проведения аукциона	**13 февраля 2023 года в 12.00** по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5, к. 2
Номер р/с для перечисления задатка	р/с BY59BELB30121325500020226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 491066041. Задаток перечисляется **до 10.02.2023 г. до 16.00** (включительно)
Условия реализации	Объект продается в собственность без условий
Месторасположение имущества	г. Гомель, ул. Севастопольская, 39А С имуществом можно ознакомиться в рабочие дни с 09.00 до 18.00, предварительно согласовав время осмотра с организатором торгов.

Победитель торгов обязан в день проведения торгов подписать протокол о результатах торгов; заключить договор купли-продажи в течение 5 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретенное имущество в течение 20 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель аукциона в течение 5 календарных дней после проведения аукциона обязан возместить затраты, связанные с организацией и проведением аукционных торгов, а также оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 5 % от конечной цены предмета торгов. Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность. Организатор торгов имеет право снять имущество с торгов не позднее, чем за пять дней до их проведения (до 08.02.2023 г. включительно). Первоначальное объявление размещено в газете «Звязда» 29.11.2022 г.

Условия аукциона:
- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведение данного платежа;
- на Покупателя возлагаются расходы, понесенные организатором торгов при проведении торгов по продаже имущества должника, в том числе оплата за размещение сведений о торгах в СМИ;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ, демонтажа;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в РУП «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

Организатором торгов является ООО «Аукцион Сервис» (адрес: г. Гомель, ул. Барыкина, 240, к. б/н).

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: 8-029-387-67-57, 8-044-736-75-70, факс 8-0232-21-09-65.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона, оператор ЭТП	ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: **www.torgi24.by**
Продавец	ОАО «Столбцовский РКБО», Минская область, г. Столбцы, ул. Я. Коласа, 28

Предмет электронных торгов:

Лот	Наименование (назначение), инвентарный номер	Начальная цена с НДС (бел. руб.)
926	Капитальное строение с инвентарным № 622/С-48252, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625485805101000125 по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Деревнянский с/с, д. Нивное, ул. Садовая, д. 18А, наименование – здание КПП, составные части и принадлежности: 1 – пристройка, А1/д – здание КПП	7 776,00
927	Капитальное строение с инвентарным № 622/С-48253, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625483404101000305 по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Налибокский с/с, аг. Налибоки, ул. Озёрная, д. 15А, наименование – здание КПП, составные части и принадлежности: А1/к – здание КПП	10 800,00

Размер шага составляет **5 %** от начальной цены лота

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 15 (пятнадцати) дней с даты подписания договора купли-продажи

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **10 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не **более 950,00 бел. руб.**

Начало торгов: 20 февраля 2023 г. в 09.00 до 16.00

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке **www.torgi24.by**.
Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**.
Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 02.02.2023 по 17.02.2023** с 9.00 до 17.00

Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: info@torgi24.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 17 февраля 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 60 % (лоты №№ 1–9); на 80 % (лоты №№ 10, 11); на 70 % (лот № 12); на 30 % (лоты №№ 13–19) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2			
1	Емкость для латекса (инв. № 142-6030)	5 184,00	**518,40**
2	Емкость для латекса (инв. № 142-6031)	5 184,00	**518,40**
3	Емкость для латекса (инв. № 142-6032)	5 184,00	**518,40**
4	Емкость для латекса (инв. № 142-6033)	5 184,00	**518,40**
5	Емкость для латекса (инв. № 142-6034)	5 184,00	**518,40**
6	Емкость для латекса (инв. № 142-6035)	5 184,00	**518,40**
7	Емкость для латекса (инв. № 142-6036)	5 184,00	**518,40**
8	Емкость для латекса (инв. № 142-6037)	5 184,00	**518,40**
9	Емкость для латекса (инв. № 142-6038)	5 184,00	**518,40**
10	Передвижная раскройная машина CS-532/18-2 (инв. № 142-42901)	48,00	**4,80**
11	Раскройная ленточная машина OSHIMA OB-900A/c (инв. № 142-43058)	1 128,00	**112,80**
12	Токарно-винторезный станок МК-6056 (инв. № 142-42579)	2 664,00	**266,40**
13	Промышленная универсальная швейная машина двухниточного челночного стежка 1022М кл. (инв. № 142-42838)	134,40	**13,44**
14	Промышленная скорняжная швейная машина 810 кл. (инв. № 142-42938)	512,40	**51,24**
15	Скорняжная машина однониточного цепного стежка GP 5- III (инв. № 145-216)	487,20	**48,72**
16	Промышленная швейная машина (с ножом) 397 М, (инв. № 142-42878)	126,00	**12,60**
17	Промышленная беспосадочная швейная машина двухниточного челночного стежка 862 кл, (инв. № 142-42829)	168,00	**16,80**
18	Полуавтомат петельный 62761- Р2 (инв. № 145-116)	411,60	**41,16**
19	Стол раскроя (инв. № 145-99)	403,20	**40,32**

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин. 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (044) 797-88-07 – заместитель директора по техническим вопросам Галактионов Виктор Владимирович.

Шаг аукционных торгов – 5 %.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 2 февраля 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 15 февраля 2023 г. в 16.00 включительно.

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты на публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Аукцион проводится в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 29.10.2022 г. № 213 (29835), от 22.06.2022 г. № 120 (29742), от 14.09.2022 г. № 180 (29802).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация – по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 5 99-18-16.

НАСТАЎНІКІ + ВУЧНІ + БАЦЬКІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Ініцыятыўныя бацькі з задавальненнем прапануюць свае ідэі, якія ўкараняюцца ў школьнае жыццё, і колькасць такіх мам і тат з часам усё павялічваецца. Яны становяцца паўнапраўнымі сацыяльнымі партнёрамі, скіраванымі на стварэнне станоўчага іміджу школы і камфортнага псіхалагічнага асяроддзя ў ёй. Ніводная значная з'ява ў школьным жыцці не абыходзіцца без удзелу бацькоў.

Дзякуючы магчымасцям актыўнага ўдзелу бацькоў у жыцці школы тут ужо склаўся шэраг традыцый. На пачатку года, напрыклад, арганізуюцца «Калядныя вячоркі», падчас якіх адзначаюць найлепшых вучняў, педагогаў і бацькоў за папярэдні год. Да гэтага дня рыхтуюцца падзячныя лісты і спецыяльная сувенірная прадукцыя. У 2020-м, напрыклад, гэта былі сертыфікаты на наведванне спартыўных аб'ектаў горада і памятныя знакі з сімволікай школы, у 2021-м — календары з фота самых адметных падзей навучальнага года. Вынікі 2022-га нядаўна падвялі ў бальнай залі Лошыцкай сядзібы, падзялілася Святлана Багдашова:

— Месца для святкавання выбралі з улікам таго, што школа падводзіла вынікі Года гістарычнай

памяці і давала старт Году міру і стварэння. У форме прэзентацыйнай галерэі вядучыя свята пазнаёмілі прысутных з 19 педагогамі, 12 бацькамі і 52 вучнямі, якія летась дасягнулі значных поспехаў.

У снежні 2022-га ў навучальнай установе прайшоў знамянальны ўрок «Пішам гісторыю школы разам», прысвечаны прысуджэнню ўстанове імя ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, жыхара Ленінскага раёна сталіцы Б. В. Карпенкі. 97-гадовы палкоўнік у адстаўцы асабіста прысутнічаў на ўроку. Сумеснымі намаганнямі школьнай адміністрацыі і бацькоў урок ператварыўся ў сапраўднае свята.

Мамы і таты вучняў, дарэчы, прысутнічаюць і на тэматычных педагагічных саветах. Традыцыйна на такія мерапрыемствы запрашаецца па адным прадстаўніку ад трох ступеняў адукацыі: пачаткавай, сярэдняй і старэйшай. Бацькі выступаюць на педсаветах з матэрыяламі па пэўнай праблеме або ў ролі экспертаў.

— Такая работа ў школе вельмі важная, бо бацькі бачаць праблемы, якія хвалююць педагогаў, удзельнічаюць у вызначэнні шляхоў іх вырашэння, дапамагаюць зірнуць на адукацыйны працэс іншымі вачыма, — падкрэсліла дырэктар. — Практыка паказвае, што такі фармат супрацоўніцтва спрыяе ўдасканаленню адукацыйнага працэсу.

Бацькі могуць аказаць істотную дапамогу і ў правядзенні выхаваўчай работы, упэўнены педагогі. Яны запрашаюць прадстаўнікоў бацькоўскай суполкі на мерапрыемствы, якія ладзяцца ў рамках рэалізацыі рэспубліканскага праекта «Крок». Прафесійныя кампетэнцыі бацькоў выкарыстоўваюцца для правядзення прафарыентацыйнай работы.

Падчас работ па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ў школе працуе творчая група з ліку бацькоў, навучэнцаў і педагогаў. Разам яны рэалізоўваюць сапраўдныя аўтарскія праекты сучаснага афармлення кабінетаў.

Такім чынам створана адукацыйная прастора ў кабінетах геаграфіі, рускай і беларускай моў, працы. Кіруе гэтай творчай групай Надзея Каплянкова, маці вучаніцы 9 «Б» класа.

Яшчэ адно традыцыйнае свята школы — навагодняя спартландыя, дзе спаборнічаюць каманда дырэктара школы, каманда вучняў 10-11 класаў і каманда бацькоў. Апошнія два гады, дарэчы, дапамагае каманда бацькоў, якую ўзначальвае Аляксандр Беразун.

Штогод найлепшых бацькоў адзначаюць падзячнымі лістамі, якія школьная адміністрацыя дасылае па месцы іх работы. Такую традыцыю распачала начальнік упраўлення па адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна Наталля Кучынская.

— Важна, што ў лістах мы просім адзначыць нашых бацькоў на працоўных сходах. Атрымліваем і зваротную сувязь ад кіраўніцтва прадпрыемстваў і самі бацькоў. І гэта моцны стымул да далейшай работы, — заўважыла Святлана Багдашова. — А падзячныя лісты да Дня настаўніка дасылаем і бацькам маладых педагогаў, якія прыйшлі да нас на працу, каб падзякаваць іх бацькам за выхаванне добрых людзей.

Ірына СІДАРОК,
фота даслана
адміністрацыяй школы № 164.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

ПАШТЭТ З КРАБАВЫХ ПАЛАЧАК

Паштэт — выдатны спосаб разнастаіць свой сняданак або перакус. Звычайна такая страва гатуецца з печані ці мяснога філе. Але не менш смачным будзе паштэт з крабавых палачак з дабаўленнем тварагу і салодкага перцу.

Спатрэбіцца: *крабавыя палачкі — 6 шт.; тварог — 100 г; салодкая молатая папрыка — 0,5 ч. л.; смятана — 1 ст. л.; часнок — 1 зубок; кроп — 2 галінкі; балгарскі перац — 0,5 шт.; соль — на смак.*

Кроп дробна пасекчы. Змяшаць яго са смятанай. Дадаць тварог з молатай папрыкай. Добра перацерці інгрэдыенты відэльцам. Здрабніць часнок і крабавыя палачкі. Дробна-дробна нашаткаваць палоўку балгарскага перцу. Перчык з часнаком і крабавымі палачкамі можна перамяшаць з дапамогай блэндара, тады маса атрымаецца больш аднастайнай.

Змяшаць усё і прысаліць.

Гатовы паштэт перакласці ў шкляную ёмістасць і адправіць хоць бы на гадзіну ў халад. Тады страва будзе густейшай і шчыльнейшай.

З паказанай колькасці прадуктаў паштэту атрымліваецца слоічак аб'ёмам 200 мл.

СЕЛЯДЗЕЦ У СЛОІКУ

Спатрэбіцца: *селядзец — 3—5 штук (у залежнасці ад памеру); для расолу — 2 літры вады, 6 сталовых лыжак солі, 2 сталовыя лыжкі цукру, перац гарошкам і лаўровы ліст.*

У ваду пакласці соль, цукар, перац і лаўровы ліст, давесці да кіпення і астудзіць расол.

Цэлыя рыбіны размарозіць, прамыць вадой і змясціць у трохлітровы слоік.

Заліць халодным растворам. Закруціць і прыбраць у халадзільнік. Праз тры дні далікатны маласольны селядзец гатовы. Чым больш ён ляжыць у расоле, тым больш падобны на рыбку сапраўднага бочкавага пасолу!

ДЭСЕРТ З МАНКІ З МАНДАРЫНАМІ

На смак вельмі нагадвае далікатны фруктовы крэм.

Спатрэбіцца: *мандарыны — 10-11 штук, манная крупы — 100 г.*

Мандарыны (лепш узяць сорт «клеменцін», яны больш салодкія) абіраем. У выніку павінна атрымацца 400 г ababранай садавіны. Затым разбіраем на долькі і максімальна пазбаўляемся ад перагародак, семечак, калі трапляюцца. Адпраўляем мандарыны ў блэндар. Трэба здрабніць іх як мага лепш. Мандарынавая маса павінна атрымацца максімальна аднастайнай кансістэнцыі.

Гатовае пюрэ з мандарынаў перакладваем у посуд з тоўстым дном. Дадаём 100 г манных круп. Інгрэдыенты старанна змешваем і ставім на пліту. Калі мандарыны з кіслінкай, дадаём на смак цукар.

Увесь час памешваючы, варым масу да загусцення. Працэс займае 5—10 хвілін.

Густую масу здымаем з агню і перакладваем у форму, загадзя засланую пергаментнай паперай. Акуратна выраўноўваем паверхню дэсерту з дапамогай лыжкі ці лапаткі.

Форму зацягваем харчовай плёнкай і прыбіраем у халадзільнік на 2-3 гадзіны.

Застылы дэсерт дастаём з формы і наразаем на парцыённыя кавалачкі.

Кожны кавалачак можна абкачаць у вафельнай крошцы ці какосавай стружцы. Гэта зусім не абавязкова, але выглядае эфэктна. Таксама ў якасці абсыпкі можна выкарыстоўваць здробненыя арэхі ці печыва.

ВАРТА ВЕДАЦЬ

ГУШЧА АД КАВЫ — ВЫДАТНАЯ СЫРАВІНА

Кававая гушча падыходзіць для мноства розных мэт. Часта яе выкарыстоўваюць у быце.

✓ Гушча ад кавы — прыродны араматызатар. Калі давялося доўга гатаваць і рукі набраліся паху цыбулі ці часнаку, можна нацерці іх вільготнай кававай гушчай.

✓ Самае незвычайнае выкарыстанне кававай гушчы — мыццё посуду. За кошт сваіх маленькіх абразіўных часцінак сродак выдатна спраўляецца з любымі забрудненнямі нароўні з содай ці бытавой хіміяй. Адціраць патэльні і каструлі кававай гушчай — адно задавальненне. Посуд будзе блішчаць, ніякай хіміі. Да таго ж рукі пасля кантакту з гушчай стануць гладкімі і далікатнымі.

✓ Кававая гушча — добрае ўгнаенне. Яна насычае зямлю карыснымі рэчывамі. Можна ўгнойваць гэтым сродкам не толькі пакаёвыя расліны, але і глебу ў садзе. Акрамя таго, кававы пах адпужвае шкоднікаў, напрыклад, смаўжоў. Калі на ўчастку з'яўляецца шмат мурашнікаў, іх можна засыпаць кававай гушчай. Мурашкі пачнуць перасяляцца ў іншае месца. Таксама дадаюць кававую гушчу ў ваду для паліву пакаёвых раслін.

✓ Дадаць кававую гушчу ў попельніцу — вось гэта ідэя! Пах дыму тут жа знікне. Таксама кава выдатна ўбірае ў сябе ўсе пахі ў халадзільніку і кухонных шафках. Каб пазбегнуць цвілі на гушчы, яе трэба прасушыць перад выкарыстаннем з мэтай асвяжыць паветра.

✓ Усё ведаюць, як добра кава афарбоўвае тканіну: праліўшы некалькі кропель на белую кашулю, адчуваеш безнадзейнасць сітуацыі. Але гэту ўласцівасць можна ўжыць з карысцю. Напрыклад, пафарбаваць кававай гушчай велікодныя яйкі.

✓ Цёмны кававы экстракт з поспехам замаскіруе драпіны на мэблі. Трэба ўсяго толькі нанесці вільготную гушчу на ватны тампон і добра пацерці паверхню. Вынік парадуе!

✓ Лайфхак для тых, у каго ёсць камін. Вільготная кававая гушча выратуе ад раскіданага попелу. Гушча звязвае попел і не дае яму разлятацца. Акрамя таго, калі дровы дагараць, пах дыму будзе прыглушаны кававым водарам.

✓ Можна выкарыстоўваць гушчу як маску-кандыцыянер для валасоў — нанясіце яе на вільготныя валасы, пакіньце на 10 хвілін. Аб'ём і шаўкавістасць валасоў — гарантаваныя! І прыемны пах як бонус.

✓ Гарачае, прыгатаванае з кававай гушчай, — гэта неверагодна смачна. Запечанае ў кававай гушчы мяса зрабіць лёгка. Дадайце ў свае рэцэпты арыгінальнасці!

У ДОБРАЙ ГАСПАДЫНІ І ПЕВЕНЬ НЯСЕЦЦА (БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ПРЫМАЎКА).

ЖАБРАЦКАЯ ДОЛЯ

Што чакае жыхароў Літвы?

Летась ў Літве павялічылася колькасць выпадкаў масавых звальненняў работнікаў. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на службу занятасці пры Міністэрстве сацыяльнай абароны і працы Літвы. Адзначаецца, што на працягу мінулага года апавяшчэнні аб звальненні, «якія насілі на гаспадарчых суб'ектах не адзінкавы, а масавы характар», былі ўручаны 5,5 тысячы чалавек. Гэта амаль на трэць (на 32 працэнты) вышэй, чым у 2021 годзе. Больш за ўсё звальненняў было зафіксавана ў сферы апрацоўчай прамысловасці, транспартных і ахоўных паслуг, сістэме адукацыі. Сярод лідараў па колькасці звальненняў — прадпрыемствы «Літоўскія чыгункі», дзе пазбавілася работы амаль дзве тысячы чалавек, і «Пошта Літвы», дзе было звольнена амаль 600 работнікаў. У суседняй дзяржаве заўважна павышаецца сацыяльная напружанасць. Што ж чакае жыхароў Літвы?

ПАЖАР ІНФЛЯЦЫІ

Летась Літва стала лідарам Еўрасаюза па росце цэн на прадукты харчавання. Аб гэтым паведаміла нацыянальнае радыё LRT. Цэны ў Літве ў сярэднім падскочылі на 34,7 працэнта. Для параўнання: у Люксембургу — на 10,8 працэнта. Пры гэтым варта ўлічваць і той факт, што жыхары Літвы з'яўляюцца аднымі з самых вялікіх спажыўцоў прадуктаў харчавання ў ЕС — 20,3 працэнта ад сумарных даходаў жыхароў. Сярод харчовых пазіцый, якія найбольш падаражэлі ў Літве ў мінулым годзе, — гарох (рост на 82,1 працэнта), ячныя крупы (78,7 працэнта), сала (77,2 працэнта).

Апошнім часам многія жыхары Літвы адмаўляюць сабе нават у традыцыйным зранку кубку кавы з-за празмерна высокіх цэн. Духмяны напой у Літве каштуе нашмат больш, чым у іншых краінах Еўропы, паведаміла LNK. Калі ў Італіі і Іспаніі кубак кавы каштуе прыкладна 1,5 еўра, то ў Літве больш чым 2,7 еўра. «Цэны даводзіцца павышаць увесь час, паколькі даражэе ўсё», — прызнаў заснавальнік кавярні Cat Cafe Таўтвідас Біцінас. Бізнес нават апасаецца, што калі ўсё будзе даражэць такімі тэмпамі, то давядзецца закрывацца.

«У нашай «вагавой катэгорыі», гэта значыць, у краінах Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, у нас кава самая дарагая, нас апярэджвае толькі Эстонія», — паведаміў эканаміст банка Luminor Жыгімантас Маўрыцас. Паводле яго слоў, цэны на каву адлюстроўваюць агульную эканамічную сітуацыю ў краіне, кубак кавы амаль за 3 еўра — гэта своеасаблівы паказчык інфляцыі. «У плане цэн мы нагналі Старую Еўропу, але па даходах расцём павольней, чым па цэнах, а з-за гэтага ў будучыні ўзнікнуць пэўныя выклікі, калі гаварыць аб канкурэнцыі і прывабнасці нашай краіны», — сказаў Жыгімантас Маўрыцас. Эксперт прызнаў, што цяперашняя сітуацыя ў Літве нагадвае «вялікі пажар інфляцыі». Пры гэтым урад, наадварот, «падлівае газу, каб падтрымаць полымя», цытуе эксперта партал Delfi. Па словах Маўрыцаса, павышэнне ключавой стаўкі не дапамагае, а толькі выцягвае з эканомікі грошы.

Яшчэ ў канцы мінулага года 35 працэнтаў жыхароў краіны адзначыла, што чакаюць моцнага негатыўнага ўплыву на свае фінансы. Такія дадзеныя выявіла апытанне грамадскай думкі, праведзенае па замове KOG Institutas. Як адзначыла кіраўнік Фінансавага інстытута Swedbank Юратэ Цвілікенэ, рост цэн і працэнтнай стаўкі па крэдытах у бюджэтах некаторых жыхароў выклікалі напружанасць. Паводле звестак Цэнтрабанка Літвы, у трэцім квартале мінулага года сума пратэрмінаваных запазычанасці атрымалнікаў спажывецкіх крэдытаў, калі плацеж затрымліваўся больш як на 90 дзён запар, была амаль на 20 працэнтаў большая, чым за той жа перыяд 2021 года.

НАЙЦЯЖЭЙШЫ КРЫЗІС

Разам з гіперінфляцыяй у Літве істотна вырасла беспрацоўе. Павялічваецца колькасць прынятых на ўлік службаў занятасці. У той жа час скарачаецца і прапанова на рынку працы. Знізілася і прадпрымальніцкая актыўнасць: колькасць выдадзеных пасведчанняў аб адкрыцці ўласнай справы таксама ўпала. Узровень жыцця ў краіне будзе паступова падаць, перакананы эканамісты. Ускосна гэта пацвярджаюць даўгі літоўцаў. Запазычанасць за электраэнергію ў краіне за месяц вырасла амаль на трэць. Сітуацыю параўноўваюць з 2008 годам, калі ў Літве пачаўся найцяжэйшы эканамічны крызіс, а ВУП упаў на 30 працэнтаў.

У студзеньскім аглядзе Swedbank Economic Outlook адзначаецца, што 2023 год для Літвы абяцае быць складаным. Эксперты канстатуюць, што пакупніцкая здольнасць хатніх гаспадарак была сур'ёзна падарваная і сёлета не адновіцца. Акрамя таго, Swedbank прагназуе, што занятасць можа заўважна скараціцца. Намецілася слабасць рынку працы, змрочная тэндэнцыя бачная ў паказчыках вакансій, якія ўпалі да найніжэйшага ўзроўню за дзесяцігоддзе (за выключэннем кароткага ўсплёску ў пачатку пандэміі). Усё большая колькасць прадпрыемстваў заяўляе, што галоўнай перашкодай для пашырэння дзейнасці з'яўляецца недастатковы попыт, а не недахоп рабочай сілы. Экспартныя замовы рэзка скарачаліся на працягу апошніх некалькіх месяцаў, адлюстроўваючы слабасць у краінах Паўночнай Еўропы і еўразоне. Аднаўленне работы прадпрыемстваў у Кітаі можа павысіць попыт на капітальныя тавары, якія вырабляюцца ў Еўропе. Аднак гэта Літвы не датычыцца, адзначылі эксперты Swedbank, паколькі краіна амаль не гандлюе з Паднябеснай, таму ніякіх ускосных станоўчых эфектаў не чакаецца, прынамсі, да другой паловы гэтага года.

Эканаміст банка SEB Тадас Павілаўскас сцвярджае, што сёлета эканамічная сітуацыя ў краіне будзе горшая, чым летась. «Мы прагназуем больш высокае беспрацоўе і даволі значную інфляцыю», — адзначыў эксперт. Праўда, ёсць і тыя эканамісты, якія працуюць у рэчышчы афіцыйнай прапаганды, якая сцвярджае, што «ўсё добра». Аднак простыя літоўцы, безумоўна, усё разумеюць. Як заўважыў на гэты конт адзін з каментатараў на партале respublika.lt, «эканамісты — цікавыя людзі. Яны глядзяць на кучу праз дробныя лічбачкі і заўсёды знаходзяць нешта пазітыўнае, але адмаўляюцца бачыць тое, што заўважаюць звычайныя грамадзяне, — паніку». Аўтар каментарыя з сарказмам працягвае: «Аказваецца, у нас росквіт. Нядрэнная ўстаноўка для дзяржавы, у якой паўмільёна чалавек жывуць ніжэй за ўзровень беднасці. А рэкордная інфляцыя — таксама яшчэ не крызіс? І дэмаграфічнага крызісу няма. Не мае значэння, што людзей памірае больш, чым нараджаецца... Калі так падумаць, мы будзем жыць як звычайна: эканамісты будуць у дабрабыце, а тыя, хто не ўмее жыць багата, патонуць у хвалях няўмольна квітнеючай эканомікі».

У СЕЙМ З СЯКЕРАЙ

Яшчэ адна сумная статыстыка. Літоўцы — адзін з самых хворых народаў у Еўропе. Працягласць жыцця ў Літве адна з самых нізкіх у ЕС (на пяць гадоў ніжэйшая, чым у сярэднім па Еўропе), а працягласць здаровага жыцця на сем гадоў карацейшая, чым у Старым Свеце, піша tv3.lt. Статыстыка сведчыць аб тым, што ў сярэднім 17 гадоў свайго жыцця літоўцы маюць хранічныя захворванні або становяцца інвалідамі. Высновы даследавання Еўракамісіі сведчаць аб тым, што гэта вынік дрэннага харчавання, недастатковай фізічнай актыўнасці, ужывання алкаголю і курэння.

Дрэннае харчаванне — прычына чвэрці ўсіх смерцяў у Літве. Людзі ядуць мала гародніны і садавіны, ужываюць шмат цукру і солі. Залішнюю вагу або атлусценне фіксуюць у паловы жыхароў Літвы. Літоўцы часцей скардзяцца на болі ў спіне і ў паясніцы, пакутуюць на сардэчна-сасудзістыя захворванні, хваробы лёгкіх. «Раней у 50-60-гадовага пацыента вызначалі некалькі хвароб, цяпер прыходзяць і 30-гадовыя, якія скардзяцца на болі ў суставах, пазваночніку, вядома, мы не можам выключыць і анкапаталогію, — заўважыла сямейны ўрач Шэшкінскай паліклінікі Рыма Рачкенэ. — І псіхалагічны стан. Часта бывае дэпрэсія, а гэта сур'ёзная хвароба».

Эксперты Еўракамісіі адзначаюць, што здароўе непасрэдна залежыць і ад даходаў чалавека. Частка літоўцаў не можа сабе дазволіць купіць добрую ежу, а атлусценне і залішнюю вагу ў 50 працэнтах выпадкаў фіксуюць менавіта ў бедных сем'ях. «Няроўнасць аказвае значны ўплыў, гэта даказана і ў Вялікабрытаніі, і ў Швецыі, маламаёмныя групы насельніцтва жывуць менш», — адзначыў дырэктар Літоўскага цэнтра сацыяльных даследаванняў Багуслаў Гружаўскі.

Загнаныя ў кут людзі рашаюцца на адчайныя крокі. У студзені каля будынка сейма Літвы была затрымана ўзброеная сякерай жанчына. Аб гэтым паведаміла прэс-служба дэпартамента паліцыі пры МУС. Змучаная жыццём жанчына планавала «палічыцца з уладай». Ажыццявіць задуманае ёй перашкодзілі супрацоўнікі дэпартамента аховы першых асоб дзяржавы, паліцэйскія і медыкі. Паводле апошніх, грамадзянка «знаходзілася ў неадэкватным стане». Прэс-аташэ Вільнюскага камісарыята паліцыі Юлія Самаракоўская ўдакладніла, што было распачата расследаванне па факце спробы замаху на прадстаўнікоў дзяржаўнай улады.

ФАКТАР БЯЗВІЗУ

Пры гэтым на вайсковыя патрэбы фінансаванне ўвесь час нарошчваецца. Прэзідэнт Літвы Гітанас Наўседа мяркуе, што ўрад можа выдаткаваць на патрэбы абароны тры працэнты ВУП замест цяперашніх 2,52 працэнта. З прэзідэнтуры такая прапанова гучала яшчэ на стадыі абмеркавання бюджэту, але была адхілена Кабінетам міністраў. Кіраўнік дзяржавы не толькі прапануе вярнуць пытанне на парадак дня, але і на ўзроўні парламенцкіх партый дамовіцца аб паслядоўным штогадовым павелічэнні вайсковых расходаў. Цяпер у Літве няма ніводнай палітычнай сілы, якая б выступіла супраць такой прапановы, адзначыў Наўседа.

Як вядома, па даручэнні ўрада міністэрства абароны Літвы актыўна праводзіць закупкі сучаснай ваеннай тэхнікі і зброі, у тым ліку рэактыўнай з максімальнымі радыусамі дзеяння. Таксама зандзіруецца глеба сярод вытворцаў беспілотных лятальных апаратаў, комплексаў супрацьпаветранай абароны сярэдняга і большага радыусаў паражэння, сучасных сродкаў контрбатарэйнай барацьбы і сувязі. Прэзідэнт Літвы заклікаў заходнія краіны да беспрэцэдэнтнай эскалацыі, наступствы якой, адзначаюць эксперты, могуць быць самымі трагічнымі. Паводле слоў Наўседы, Захаду «неаднойчы атрымлівалася сцірацъ» чырвоныя лініі.

Літоўскія ўлады усяляк абмяжоўваюць супрацоўніцтва з нашай краінай. Як стала вядома, урад Літвы прыняў рашэнне дэнансаваць падпісаную 16 гадоў таму дамову з Беларуссю аб прыгранічным супрацоўніцтве, паведаміла літоўская тэлерадыёкампанія LRT. Працэс дэнансацыі быў ініцыіраваны міністэрствам унутраных спраў Літвы. Раней у ведамстве заяўлялі, што ў цяперашняй геапалітычнай сітуацыі рэалізацыя дамовы немагчымая і не стане магчымай у найбліжэйшы час. Дагавор аб прыгранічным супрацоўніцтве паміж Літвой і Беларуссю быў падпісаны ў Вільнюсе 1 чэрвеня 2006 года. У дакументе вызначаны сферы прыгранічнага супрацоўніцтва. Так, прадугледжвалася супрацоўніцтва ў галіне інфраструктуры, аховы навакольнага асяроддзя, эфектыўнага выкарыстання энергарэсурсаў, турызму, адпачынку, спорту, культурнай спадчыны, адукацыі, дзелавой інфраструктуры, перамяшчэння транспартных сродкаў і пасажыраў праз мяжу і г. д. Бакі дамаўляліся аб абмене інфармацыяй паміж дзвюма краінамі і аказанні дапамогі на граніцы ў выпадку надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару. Яшчэ да дэнансацыі дамовы ўрад Літвы спыніў фінансаванне праектаў па прыгранічным супрацоўніцтве з Беларуссю.

Такая пазіцыя ўладаў не перашкаджае развіваць добрасуседскія адносіны паміж народамі. Сведчанне таму — папулярнасць беларускага бязвізу ў жыхароў суседніх дзяржаў. За мінулы тыдзень нашу краіну наведала па бязвізавым рэжыме больш за 10 тысяч замежнікаў. Аб гэтым паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце. З пачатку года ў Беларусь у бязвізавым парадку ўехала звыш 33 тысяч замежнікаў, з іх каля 25 тысяч — грамадзяне Літвы. Усяго з пачатку дзеяння бязвізу для жыхароў суседніх краін ЕС у Беларусь прыбылі 418,2 тысячы іншаземцаў. Больш за палову з іх (272,6 тысячы чалавек) — жыхары Літвы. Як вядома, чалавек выбірае дзе лепш. Хіба не так?

Пётр ДУНЬКО.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Борисовский завод «Автогидроусилитель», Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 56
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов: оборудование, бывшее в употреблении
Месторасположение: Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 61

№ лота	Наименование (назначение)	Год выпуска	Инв. номер	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	Станок токарно-винторезный 1К625	1970	4-313	7 920,00
2	Станок токарно-винторезный 1К62	1972	4-942	3 840,00
3	Станок токарно-винторезный 1К62	1975	4-2438	5 040,00
4	Станок токарно-винторезный 16К20	1976	4-2986	8 040,00
5	Станок токарно-винторезный 16К20	1978	4-3660	8 040,00
6	Станок токарно-винторезный 16К25	1981	4-4813	16 920,00
7	Станок токарно-винторезный 16К25Г	1982	4-5201	11 760,00
8	Станок токарно-винторезный 16Д20	1987	4-7362	6 960,00
9	Станок Токарно-винторезный 1К62Д75	1992	4-9688	13 800,00
10	Станок заточной для резцов 3622	1977	4-3188	4 920,00
11	Станок горизонтально-расточной 2622В	1969	4-80	28 320,00
12	Станок горизонтально-расточной 2А622Ф4-1	1988	4-7603	70 200,00
13	Станок координатно-расточной 2455АФ1	1980	4-4345	34 800,00
14	Станок плоскошлифовальный 3Г71	1969	4-62	6 000,00
15	Станок плоскошлифовальный 3Б722	1969	4-104	16 680,00
16	Станок плоскошлифовальный ВСЗ-34	1975	4-2691	21 720,00
17	Станок плоскошлифовальный 3Б722	1976	4-2765	16 800,00
18	Полуавтомат торцекруглошлифовальный 3Т153Е	1991	4-9263	14 400,00
19	Станок внутришлифовальный 3А228	1975	4-2570	15 000,00
20	Станок универсально-шлифовальный 3У131	1986	4-6847	21 000,00
21	Станок круглошлифовальный 3А151	1973	4-1562	13 800,00
22	Станок универсально-заточной 3Е642	1992	4-9637	6 000,00
23	Станок точильно-шлифовальный ВЗ-379-01	2004	4-12319	3 000,00
24	Станок хонинговальный 3М83	1974	4-2360	6 240,00
25	Станок резьбошлифовальный 5К822	1989	4-8423	17 160,00
26	Станок вертикально-фрезерный 6С12	1981	4-4851	6 120,00
27	Станок консольно-фрезерный 6Р11	1978	4-3699	6 960,00
28	Станок вертикально-фрезерный консольный 6Д12Ф20	1991	4-8993	20 520,00
29	Станок вертикальный консольно-фрезерный 6Р12	1973	4-10736	8 640,00
30	Станок специализированный фрезерный консольный ВМ127М	1992	4-9902	16 200,00
31	Станок консольно-фрезерный FD-40V	1987	4-5308	33 960,00
32	Станок консольно-фрезерный FW-400	1975	4-7508	18 240,00
33	Станок консольно-фрезерный FSS400	1987	4-2468	19 560,00
34	Станок вертикальный консольно-фрезерный FSS400/E	1969	4-7279	19 560,00
35	Станок поперечно-строгальный 7Б35	1992	4-112	4 560,00
36	Станок поперечно-строгальный 7305ТД	1970	4-9638	7 080,00
37	Станок поперечно-строгальный 7Б35	1979	4-221	4 560,00
38	Автомат отрезной круглопильный 8Г662	1998	4-4096	6 600,00
39	Станок ножовочный отрезной МП-1697	1969	4-11326	3 600,00
40	Станок токарно-винторезный 1А616П	1982	4-1597	4 440,00
41	Станок радиально-сверлильный РБ-40	1967	4-5028	11 400,00
42	Станок продольно-фрезерный 6632	2005	4-12452	15 600,00

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by.
Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения.
Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **от 9 до 10 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
06.03.2023 с 11.00 до 13.00
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок:
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **03.03.2023** до **17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные:
Тел.: +375 17-373-21-33;
+375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов: оборудование, реализуемое одним лотом, по адресу:
Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19

Наименование	Начальная цена с НДС 20 %
Экструзионная линия, модель «FCL 21/SH PROCAST», для производства стреч-пленки (экстструдер в сборе) Dolce, 2004 г. в., инв. номер нф00028	**2 009 904,00** бел. руб. (снижение 35 %)
Холодильное оборудование № 1, Dolce, 2015 г., инв. номер нф00027	

Задаток 5 % от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 90 календарных дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 14.12.2022 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
с 11.00 до 13.00 21.02.2023.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 20.02.2023 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 (17) 280-36-37; 8029-317-95-42.** **E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «1-я Минская птицефабрика» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

• **склад-холодильник** *(составные части и принадлежности: 3 (три) навеса)*, **инв. № 601/С-31936 общей площадью 145,8 кв. м;**
• **убойный цех** *(составные части и принадлежности: 2 (два) навеса)*, **инв. № 601/С-31941, общей площадью 1000,4 кв. м, с технологическим оборудованием «Szlachet-Stal»;**
• **столярный цех, инв. № 601/С-31938, общей площадью 460,1 кв. м;**
• **склад канцкормов** *(составные части и принадлежности: операторская, навес с автовесами)*, **инв. № 601/С-31943, общей площадью 402,2 кв. м;**
• **склад ГСМ, инв. № 601/С-31937, общей площадью 64,5 кв. м;**
• **свинарник, инв. № 601/С-31935, общей площадью 296,4 кв. м;**
• **сарай-гараж с/х** *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 601/С-31929, общей площадью 553 кв. м;**
• **пункт техобслуживания, инв. № 601/С-31932, общей площадью 719,9 кв. м;**
• **птичник № 14, инв. № 601/С-31925, общей площадью 1329,2 кв. м;**
• **проходная, инв. № 601/С-31942, общей площадью 49 кв. м;**
• **мойка для машин, инв. № 601/С-31928, общей площадью 6,6 кв. м;**
• **мехмастерская** *(составные части и принадлежности: пристройка, беседка)*, **инв. № 601/С-31927, общей площадью 565,7 кв. м;**
• **котельная** *(составные части и принадлежности: насосная, дымовая труба)*, **инв. № 601/С-31939, общей площадью 892,9 кв. м;**
• **гараж на 25 автомашин, инв. № 601/С-31926, общей площадью 506,9 кв. м;**
• **ветсанпропускник убойного цеха** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-31940, общей площадью 578,2 кв. м;**
• **административное здание** *(составные части и принадлежности: подвал, 2 (две) пристройки, котельная)*, **инв. № 601/С-31931, общей площадью 1072,1 кв. м;**
• **весовая** *(составные части и принадлежности: навес с автовесами)*, **инв. № 601/С-31934, общей площадью 15,2 кв. м;**
• **птичник № 1** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22689, общей площадью 1749,7 кв. м, с оборудованием Big Dutchman Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек;**
• **птичник № 2** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22690, общей площадью 2003,8 кв. м, с оборудованием Big Dutchman для выращивания бройлеров напольного содержания;**
• **птичник № 3** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22691, общая площадь – 1752,7 кв. м, с оборудованием Big Dutchman Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек;**
• **птичник № 4** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22692, общей площадью 1789,8 кв. м, с оборудованием Big Dutchman для выращивания бройлеров напольного содержания;**
• **птичник № 5** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22693, общей площадью 1753,2 кв. м, с оборудованием «Техна» для клеточного содержания кур-несушек;**
• **птичник № 6** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22694, общей площадью 1411,8 кв. м;**
• **птичник № 7** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки, уборная)*, **инв. № 601/С-22695, общей площадью 1424 кв. м;**
• **птичник № 8** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22696, общей площадью 1318 кв. м;**
• **птичник № 9** *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 601/С-22697, общей площадью 1270,1 кв. м;**
• **птичник № 10** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22700, общей площадью 1910,4 кв. м;**
• **птичник № 11** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22698, общей площадью 1311,6 кв. м;**
• **птичник № 15** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22699, общей площадью 1739,4 кв. м, с оборудованием Big Dutchman Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек.**
Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623200000033000024 площадью 54,2646 га ***(право постоянного пользования)*** **по адресу: Минская область, Логойский район, Плещеницкий с/с, 4.**
Земельный участок имеет ограничения в использовании: прибрежная полоса р. Двиноса, пл. 1,0900 га; водоохранная зона р. Двиноса, пл. 38,5276 га; охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 3,6770 га;
• **цех переработки мяса** *(составные части и принадлежности: подвал, вход в подвал, навес)* **с комплектом оборудования для производства колбас, комплексом копчения и камеры коптильной, инв. № 601/С-28939, общей площадью 410,6 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 623200000033000063 площадью 0,1924 га** ***(право постоянного пользования)*** **по адресу: Минская область, Логойский район, Р-63, 67-й км, 1/2.**
Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона р. Двиноса, пл. 0,1924 га; охранная зона линий электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0050 га; охранная зона линий электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0430 га; охранная зона придорожной полосы (контролируемая зона) автомобильных дорог, пл. 0,0785 га.

С полным перечнем оборудования можно ознакомиться у организатора аукциона.
Начальная цена с НДС (20 %) **– 2 197 368,00** бел. руб.
Начальная цена снижена на 40 %.
Задаток 10 % от начальной цены **– 219 736,00** бел. руб.
Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», код 369, г. Минск, ул. Чкалова. 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в размере 1 (одного) процента. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**
Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 16.11.2021, 23.02.2022, 28.04.2022, 14.07.2022, 10.01.2023.
Аукцион состоится **13.02.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.02.2023** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.
Тел.: (8017) 516-80-65 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: (8017) 504-83-58, (029) 116-45-00.

УНН 600068728

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Минское производственное кожевенное объединение» (продавец) проводит повторный открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ КОТЕЛЬНОЙ

с инв. № 600/С-42335 общей площадью 2479,5 кв. м *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623684300001001047 (право постоянного пользования) площадью 0,8869 га, по адресу: Минская область, Минский район, Новодворский с/с, 4А, район аг. Гатово.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона особо охраняемых природных территорий, пл. 0,8869 га, охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, пл. 0,1408 га, охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, пл. 0,0600 га, охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В, пл. 0,0432 га.
Начальная цена с НДС (20 %) **– 435 055,44** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **43 505,00** бел. руб.
Начальная цена снижена на 50 %.
Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.
Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 28.12.2022.
Аукцион состоится **15.02.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.02.2023** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.
Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.
Тел. для осмотра: 8 (017) 517-22-48, 8 (029) 717-19-22.

УНП 600208238

КАВЯРНЯ ДЛЯ СІНІЧАК

Як частаваць птушак правільна і чаму небяспечна вешаць кармушкі на вокны

Гадоў пяць таму ўзімку я зайшла ў кавярню-кнігарню каля Нацыянальнага мастацкага музея і ўбачыла там рарытэтны чамадан-вітрыну, напоўнены папяровымі пакуначкамі з надпісам «Корм для птушак». Як высветлілася, прынесла яго пастаянная наведвальніца, актрыса дзіцячага тэатра. Яна марыць, каб у горадзе з'явіліся месцы, дзе кожны ахвотны па дарозе на работу, спатканне ці дадому мог бы бясплатна ўзяць корм для сініц і вераб'ёў, каб падтрымаць іх у суровыя зімнія дні.

Празрыстыя кармушкі — самыя эфектныя для назірання, але тут ёсць падводныя камяні…

Не выкідайце вішнёвыя костачкі

І гэта не адзіная ініцыятыва гараджан, накіраваная на дапамогу птушкам. Падчас падрыхтоўкі матэрыялу ў інтэрнэце я натрапіла на адвэнт-каляндар «Два вераб'і». У яго ўваходзіць драўляная кармушка, правільны корм і розныя заданні, звязаныя з птушкамі, якія бацькі могуць у чаканні Каляд выконваць разам са сваімі дзецьмі. Падумалася, што ён можа быць актуальны ўсю зіму, бо дапаможа ў гульнявой форме прывучыць хлопчыкаў і дзяўчынак да клопату аб птушках.

Сябар маёй калегі, які вельмі любіць птушак, сёлета пачаў рабіць на продаж металічныя арт-кармушкі з бярозавай палачкай, на якой могуць сядзець крылатыя госці. Такая бізнес-ідэя цікавая сваімі інтэрактыўнымі момантамі. Можна, напрыклад, пайсці ў лес з дзіцем, знайсці палачку, якая спадабалася, і ўставіць яе ў адтуліны замест купленай. Акрамя таго, да кожнай кармушкі прыкладаецца картка з выявамі птушак, пры дапамозе якой можна гуляць ва «Угадай, хто прыляцеў».

Майму сыну на Новы год Дзед Мароз прынёс цукеркі ў кармушцы замест пакунка. Перш чым яе павесіць, мы з Сымонам вырашылі даведацца, як дапамагаць птушкам правільна. Што можна класці ў кармушку? А якая ежа для птушак шкодная?

Шматдзетны тата з Новалукомля Віталь Кашчэеў цікавіцца птушкамі з дзяцінства. Біёлаг па адукацыі, ён працуе на Лукомльскай электрастанцыі машыністам. У вольны час неабыякавы аматар птушак назірае за іх паводзінамі і міграцыяй, кальцуе, у сцюжу вывешвае кармушкі, падсыпае корм. Паводле яго слоў, самы ўніверсальны корм для дробных птушак — несалёныя нясмажаныя семечкі сланечніка.

— Яны заўсёды ідуць на ўра, — кажа Віталь. — Я іх звычайна купляю на рынку, кілаграм каштуе каля 3-4 рублёў.

Ёсць месцы, дзе прадаюць семкі спецыяльна для птушак. Праўда, яны нічым не адрозніваюцца ад семак для людзей, проста не адсартаваныя па памеры. Людзі, якія не першы год кормяць птушак, заказваюць іх увосень у фермераў. Мая былая аднакурсніца, дарэчы, купляе на сезон цэлы мяшок. За 25 кілаграмаў аддала 85 рублёў.

— Яшчэ адна недарагая альтэрнатыва — авёс, на рынку вядро можна купіць за 4 рублі, — працягвае Віталь. — Я насыпаю ў кармушкі сумесь з аўса, насення кабачкоў, гарбузоў, сланечніку, проса, рапсу, ільну, журавін, кавалачкаў яблыкаў. А яшчэ рэгулярна раблю тлушчавыя падкормкі. Свіны тлушч (здор) растапліваю ў каструлі, засыпаю туды семечкі сланечніка, перамешваю і заліваю ў паліванкі шкарлупіны ад какосавых арэхаў, у якіх загадзя раблю дзірачку. Калі тлушч застывае, падвешваю доўгайграючыя кармушкі на дроціку на галінкі. Сінічкі радуюцца такому пачастунку.

Падобным чынам робяцца і сытныя шарыкі-кармушкі. Замест жывёльнага тлушчу можна растапіць какосавы алей (для мяккасці раяць дадаць крыху сланечнікавага ці рапсавага алею). Унутр кожнага

Ядомыя шарыкі для птушак робяцца зусім проста.

шарыка абавязкова трэба залажыць нітку, каб потым яго можна было падвесіць. А каб птушкі маглі садзіцца і есці, у корм устаўляюцца кароткія палачкі. Маніпуляцыі з ніткай і палачкамі можна не рабіць, калі купіць адмысловыя кармушкі ці металічныя спіралі для падвешвання кармавых шарыкаў. Такія ядомыя сферы маюць перавагу над драўлянымі домікамі. Бо апошнія неабходна рэгулярна чысціць — прыбіраць астаткі корму і памёт, каб птушкі не захварэлі.

— Акрамя таго, здорам можна мазаць ствалы дрэў, — кажа заўзяты аматар птушак з Новалукомля. — На такія ствалы прылятаюць частаваццца дзятлы. Будуць рады і сініцы прычэпленаму на галінку кавалку несалёнага нясмажанага сала. Летам, падчас сезона загатовак, я нарыхтоўваю вішнёвыя костачкі. Гэта любімы ласунак дубаносаў. Абавязкова сушу насенне кабачкоў, якое звычайна ніяк не выкарыстоўваецца, нарыхтоўваю семечкі гарбуза, бо апошнія дорага каштуюць. Можна купіць той жа корм для хвалістых папугаяў у заакрамеі і высыпаць у кармушкі. Многія падкормліваюць птушак несалёным арахісам. Можна проста разрэзаць какос і падвесіць: сініцы будуць есці яго з задавальненнем. Але гэта ўсё не вельмі танна. Я ж выступаю за бюджэтныя спосабы кармлення.

Ні ў якім разе нельга карміць птушак са стала. Ім нельга нічога смажанага, печанага і салёнага. Хлеб і батон, як свежыя, так і сухія, таксама непрыдатныя ў якасці корму.

Кінатэатр для коціка

Сёння модна павесіць кармушку за акном. Сярод маіх знаёмых многія так робяць. Піць каву ранкам пад любімую музыку і назіраць, як птушкі за шклом клююць семкі, — пагадзіцеся, чым не рамантыка.

Сумяшчае прыемнае з карысным і мая прыяцелька. Штогод у канцы восені Надзя вывешвае драўляную кармушку за акном. Шматдзетная мама жыве побач з паркам на пятым паверсе, і птушак там вельмі шмат.

— Вельмі цікава назіраць, як па-рознаму яны ядуць. Сініцы акуртна бяруць адну семачку і злятаюць з ёй на найбліжэйшае дрэва. Вераб'і доўга сядзяць у кармушцы і спрабуюць раскрыць семачку дзюбай. Дубанос жа, здаецца, гадзінамі можа прымаць ванны з семачак, з'ядае шмат, пакідаючы шалупайкі ў кармушцы.

Надзя цяпер у дэкрэтным водпуску. Кажа, што паспявае прыгатаваць абед, пакуль яе дзеткі-пагодкі захоплена назіраюць за птушкамі. А старэйшая дачка штодня перад школай з задавальненнем напаўняе кармушку семкамі.

— Калі знімаю па вясне кармушку, больш за ўсё сумуе наш кот Рудзік. Бо назіраць за птушкамі праз акно яго галоўная забаўка, такі сабе кашачы кінатэатр. Многія сябры пасля таго, як пабылі ў нас у гасцях, таксама купілі кармушку і павесілі ў сябе, каб часцей бачыць птушак за акном. А мой муж зрабіў драўляны дамок і занёс яго да сябе ў офіс. Кажа, гэта дапамагло згуртаваць калектыў, бо з'явіўся агульны прыемны сумесны занятак.

— Бёрдвотчынг — вельмі папулярнае хобі ва ўсім свеце, — кажа Віталь Кашчэеў. — Людзі без спецыяльнай адукацыі, розных прафесій і ўзростаў, купляюць дарагія фотаапараты, біноклі і назіраюць за птушкамі. Ёсць школы і акадэміі бёрдвотчынгу. У гэтым годзе на тэрыторыі Беларусі зафіксавана 342 віды птушак. Я ў сацсетках назіраў за групай людзей, якія зладзілі спаборніцтвы: хто сфатаграфуе больш за ўсё птушак на працягу года. Дык вось дзяўчына, якая заняла першае месца, зняла на камеру ажно 262 віды.

Назіраць за птушкамі і здымаць відэа больш зручна пры дапамозе празрыстых кармушак. Яны з лёгкага акрылавага шкла, на прысосках, іх вешаюць непасрэдна на вокны. У адрозненне ад драўляных такія кармушкі лёгка мыць. Праўда, каштуюць яны нятанна, самая маленькая — сорак рублёў. У якасці альтэрнатывы, кажуць, можна выкарыстаць паліцу для ваннай з прысоскамі.

— Празрыстыя кармушкі, зразумела, самыя эфектныя для назірання, але тут ёсць падводныя камяні. Людзі, якія вешаюць іх на акно, павінны быць гатовымі да непрыемных сюрпрызаў, — кажа Віталь Кашчэеў. — Ястраб-перапёлачнік, які палюе на дробных птушак, можа спікіраваць у такую кармушку. Ад удару драпежнікі, як правіла, разбіваюцца і гінуць. А буйны ястраб-цецяроўнік можа нават прабіць шыбу. Мне сёлета званілі па такім пытанні. Даведваліся, што рабіць з ястрабам, які сутыкнуўся з акном. Дзякуй богу, усё абышлося, птушка праз дзень прыйшла ў сябе, і яе выпусцілі на волю. Менавіта з гэтай прычыны на шкло наогул не рэкамендуецца вешаць празрыстыя кармушкі. Акрамя таго, у прыватных дамах вельмі часта ставяць вялікія вітрынныя вокны. Яны таксама з'яўляюцца пасткамі для птушак, якія аб іх разбіваюцца. Для таго каб пазбегнуць гэтага, прадаюцца ўльтрафіялетавыя маркеры. Імі можна намаляваць гарызантальныя палоскі, каб гэтыя вокны былі бачнымі для птушак.

І да вясны вісяць пустыя…

Кармушкі могуць быць вельмі прыгожымі, я бачыла нават унікальныя экзэмпляры з ручным роспісам. Але гэта не значыць, што яны прывабяць птушак. Знаёмая распавядала, што ёй з-за мяжы сяброўка прывезла стыльную празрыстую кармушку з дазатарам і двума аддзяленнямі для корму. Але ў яе прыляталі толькі сінічкі. А яна хацела, каб было значна больш відаў. Пасля таго як Таня павесіла самаробную кармушку з пластыкавага кантэйнера ад шампіньёнаў (прымацавала вяровачкі, завязала на вузел і вешала проста на акно: кармушка звонку, а вузельчык знутры), у так званую ванную з семачак сталі прылятаць самыя розныя птушкі — дамавыя і палявыя вераб'і, дубаносы, папаўзні, зелянушкі, лазараўкі, чачоткі, таўстадзюбы, гілі, дзятлы, сойкі, чыжы, амялушкі…

— Раней я сам рабіў драўляныя кармушкі і развешваў па горадзе ўздоўж сваёй дарогі на работу, але іх пастаянна хтосьці ламаў ці яны знікалі, — кажа Віталь. — Таму апошнім часам выразаю невялікія акенцы ў пластыкавых бутэльках і развешваю на дрэвах. Калі будзеце рабіць такія кармушкі, не выкарыстоўвайце каляровы пластык. Толькі празрысты, які добра праглядаецца. Калі павесілі кармушку з пластыкавай бутэлькі ці з пакета з-пад малака, не забудзьце зняць іх вясной і ўтылізаваць, бо адмоўны момант такіх кармушак, што яны вісяць гадамі і псуюць выгляд двару і парку.

Галоўныя патрабаванні да кармушкі: каб дно было з адтулінамі, адкуль будзе выцякаць лішняя вільгаць. Дах і невялікі борцік, каб корм не намакаў і насенне не здзьмула ветрам. Лепш рабіць некалькі ўваходаў, каб птушка адчувала сябе ў бяспецы.

— Я ў сваёй дачкі нядаўна спытаў: «У вас у школе вешалі кармушкі?» — «Вешалі». — «А хто-небудзь корміць зараз птушак?» — «Не», — кажа Віталь Кашчэеў. — Праблема большасці кармушак у тым, асабліва калі акцыя праходзіць у школах ці дзіцячых садках, што іх робяць вельмі шмат, развешваюць на прышкольным участку, але потым не насыпаюць нічога. І яны да вясны вісяць пустыя. Ад такіх кармушак наогул ніякага сэнсу. На адну школу дастаткова пары кармушак, галоўнае, каб туды рэгулярна штосьці засыпалася. Лепш няхай дзеці забяруць сваю кармушку і павесяць побач з домам, каб рэгулярна падсыпаць корм па дарозе ў школу. А на ўроках прыносяць фотаздымкі.

Калі кармушак няма, можна высыпаць корм на ўтаптаную сцяжынку ў дварэ ці парку. Так робіць тата маёй калегі. Ён жыве ў прыватным сектары ў Лепелі. І птушкі, ведаючы такі яго рытуал, злятаюцца імгненна.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Лебедзяў і качак карміць наогул не рэкамендуецца

На Чыжоўскім вадасховішчы пастаянна бачу, як бацькі з дзеткамі кормяць качак і лебедзяў хлебам ды батонам. Мой сын таксама хацеў пакарміць, але я патлумачыла, што так лепш не рабіць. Тады Сымон падышоў да таты з дачкой, якія кідалі ў ваду батон, і сказаў: «А мама сказала, што качак хлебам карміць нельга». У выніку, дзякуючы дзіцячай непасрэднасці, мы разгаварыліся, і я падзялілася, што карміць лебедзяў і качак лепш аўсянымі шматкамі альбо прарошчаным зернем.

Паводле слоў Віталя Кашчэева, вадаплаваючых птушак наогул не рэкамендуецца падкормліваць, таму што ў іх прытупляецца інстынкт да міграцыі. У прыватнасці, лебедзі павінны злятаць у вырай, але масава застаюцца зімаваць на некаторых беларускіх вадаёмах. Напрыклад, на Лукомльскім возеры сёлета зімуе каля сотні, а ў асобныя гады і 400—500 птушак. У Новалукомлі лебедзі — гэта атракцыён, бацькі прыводзяць сваіх дзетак на бераг вадаёма, каб малыя паглядзелі на птушак, часам нават пагладзілі. 90 працэнтаў з іх прыносяць з сабой хлеб і батон. Але асабліва ва ўмовах вялікіх гарадоў, такіх як Мінск, дзе ў птушак абмежаваныя магчымасці змяшаць гэты корм з натуральнай ежай з дна вадаёма, кармленне батонам і хлебам можа прывесці іх да гібелі.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Бывалыя агароднікі вядуць нататнікі, дзе адзначаюць любімыя сарты, малююць схему ўчастка з указаннем культур, якія раслі на тых ці іншых градках. Часу гэта займае нямшмат, а карысць велізарная. Бо дакладная схема дазваляе скласці ідэальны план пасадак з улікам севазвароту.

ПЛАНУЕМ ГРАДКІ ПА ПРАВІЛАХ

Галоўнае правіла — расліны не варта вырошчваць на адным месцы больш за два гады запар, а лепш мяняць культуры на градках кожны год. Больш за тое, мяняць трэба не толькі культуры, але і сямействы, да якіх яны адносяцца. Напрыклад, бульба і тамат адносяцца да сямейства паслёнавых, і таму на наступны год пасля бульбы нельга вырошчваць памідоры. Ці пасля капусты нельга вырошчваць радыску, а пасля морквы — пятрушку.

У раслін аднаго сямейства агульныя хваробы і шкоднікі, яны назапашваюцца ў глебе, і ўраджайнасць рэзка зніжаецца.

Падобныя культуры выносяць з грунту адны і тыя ж элементы сілкавання.

Некалькі згладзіць усе гэтыя негатыўныя з'явы дапамагае ўнясенне арганічных угнаенняў, якія папаўняюць глебу пажыўнымі рэчывамі, аднак ніяк не знішчаюць інфекцыю і шкоднікаў. Таму выконваць севазварот ці хоць бы пладазмен трэба! Гэта датычыцца і вялікіх палёў, і маленькіх градак.

Выключэннем з гэтага правіла служаць бульба і кукуруза, якія можна вырошчваць на адным месцы некалькі гадоў запар, пры гэтым не назіраецца рэзкага зніжэння ўраджайнасці і іншых негатыўных з'яў. Але гэта не значыць, што бульбу можна вырошчваць на адным участку дзесяць гадоў запар.

Даваць «адпачываць» зямлі трэба і ад бульбы.

Пры размяшчэнні гародніны на градках варта ўлічваць і наяўнасць шматгадовых раслін. Напрыклад, паблізу ад хрэну нельга высейваць насенне іншых прадстаўнікоў сямейства капусных, бо ранняй вясной на ім з'яўляецца капусная блыха, якая з радасцю пераключыцца і на іншыя расліны.

Пры распрацоўцы севазвароту трэба ўлічваць, што большасць шкодных мікробаў захоўваюць сваю жыццяздольнасць у глебе не больш за пяць гадоў, і калі вы вытрымаеце гэты тэрмін, то яны загінуць ад бяскорміцы. На аснове гэтай асаблівасці распрацавана сістэма чатырох квадратаў, якая прадугледжвае вяртанне раслін на ранейшае месца праз чатыры гады. Такім чынам, напрыклад, можна цалкам пазбавіцца ад кілы капусты. Пасля выяўлення хваробы на градцы нельга вырошчваць не толькі капусту, але і іншых прадстаўнікоў сямейства крыжакветных на працягу чатырох гадоў. Калі ў перыяд такога каранціну пасееце там, напрыклад, рукалу, то споры кілы ажывуць, і тэрмін каранціну трэба будзе адлічваць ізноў.

Каб спрасціць працэс севазвароту, можна ўзяць за правіла сартаваць усё насенне на чатыры групы: ліставыя, пладовыя, каранеплоды і бабовыя. Агарод у думках дзелім на чатыры ўчасткі. На першым вырошчваем пладовыя. На другім — караняплоды, на трэцім — бабовыя, на чацвёртым — ліставыя. У наступным годзе зрушваем усе расліны на адну пазіцыю (пладовыя — на чацвёрты ўчастак, ліставыя — на трэці і г. д.). Такім чынам атрымліваецца лёгка выконваць севазварот. Культуры вяртаюцца на ранейшае месца толькі праз тры гады і не трэба складаных разлікаў і планавання.

Чаргаваць культуры на ўчастку трэба не толькі з улікам сямействаў, але і па патрабавальнасці да ўрадлівасці грунту.

«Аматараў смачна паесці» (крыжакветныя, гарбузовыя) вырошчваюць на самым урадлівым участку, куды восенню ўносяць максімум угнаенняў.

У наступным годзе на іх месцы (але ўжо без унясення арганікі) сеюць другую па патрабавальнасці да сілкавання групу — паслёнавыя.

На трэці год займаюць гэтыя градкі парасонавымі.

На чацвёрты год сеюць бабовыя, якія самі ўзбагачаюць глебу азотам і паляпшаюць яе структуру. Плюс восенню ўносяць на гэтыя градкі мінеральныя ўгнаенні і гной. А вясной ізноў высейваюць тут насенне першай групы раслін.

ПАМЯТКА. Прыналежнасць раслін да сямействаў

Астравыя — салата, артышок, эстрагон, салатны цыкорый, сланечнік.

Бабовыя — бабы, віка, гарох, лубін, соя, фасоля, сачавіца.

Грэчкавыя — рэвень, шчаўе, грэчка.

Капусныя — дайкон, усе віды капусты, крэс-салата, ліставая гарчыца, радыска, рэдзька, рэпа, хрэн, рукала.

Цыбульныя — усе віды цыбулі, чарэмшына, часнок, ракамболь.

Амарантавыя — буракі сталовыя, шпінат, мангольд.

Паслёнавыя — баклажан, бульба, перац, тытунь, тамат, фізаліс.

Сельдэрэйныя (парасонавыя) — аніс, кервель, каляндра, морква, пастарнак, пятрушка, сельдэрэй, кмен, кроп, фенхель.

Гарбузовыя — кавун, дыня, кабачок, агурок, патысон, гарбуз, лагенарыя, мамордзіка.

Яснотkавыя — базілік, ісоп, маяран, меліса, мята перачная, чабор.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.55	17.52	8.57
Віцебск —	8.49	17.37	8.48
Магілёў —	8.45	17.42	8.57
Гомель —	8.36	17.44	9.08
Гродна —	9.10	18.08	8.58
Брэст —	9.05	18.14	9.09

Месяц

Першая квадра
28 студзеня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Рымы, Яфіма.*
К. СТРЭЧАННЕ ГАСПОДНЯЕ. *Марыі, Карнеля, Міраслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

2 ЛЮТАГА

У краіне

1348 год — адбылася бітва беларуска-літоўскіх войскаў з крыжакамі на рацэ Стрэве (прыток Нёмана каля Коўна). Маскоўскія летапісы, якія амаль зусім не звярталі ўвагі на барацьбу ВКЛ з крыжакамі, унеслі наступную вестку аб той бітве: «Бой был немцем с Литвою на Страве реце и побиша Литвы 40 000». Нямецкія храністы перабольшвалі яе маштаб, але, напэўна, паражэнне было вельмі цяжкім. Сярод загінулых названы Монтвід і Нарымонт, браты Альгерда. У гонар перамогі ў Кёнігсбергу ордэнам крыжаносцаў была пабудавана царква Дзевы Марыі (лічылася заступніцай ордэна). Між тым ордэн не змог скарыстацца вынікамі перамогі: у Еўропе бушавала эпідэмія чумы, людскія рэсурсы ордэна моцна зменшыліся, ціск крыжакоў на літоўскія заходнія і паўночна-заходнія граніцы ў наступныя гады няўхільна зніжаўся.



1386 год — падчас агульнага з'езду шляхты ў Любліне вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага Ягайла абраны каралём Польшчы пад імем Уладзіслава II.

1536 год — нарадзіўся Пётр Скарга, пісьменнік, дзеяч Контррэфармацыі ў Рэчы Паспалітай, першы рэктар Віленскага ўніверсітэта. З 1588 года прыдворны прапаведнік караля Жыгімонта III Вазы, які цаніў яго за выдатны дар красамоўства. Стаў прыхільнікам абмежавання ўлады Сейма і пашырэння ўладных паўнамоцтваў караля, адным з ініцыятараў Брэсцкай царкоўнай уніі. Рэлігійны саюз зменшыць адасобленасць і варожасць паміж праваслаўнымі і католікамі, створыць умовы для развіцця навукі і народнай асветы і ўмацуе ўнутранае адзінства і палітычную магутнасць Рэчы Паспалітай.

1938 год — нарадзілася (в. Астрашыцкі Гарадок) Таццяна Дзмітрыеўна Самусенка, беларуская спартсменка (фехтаванне на рапірах), заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі. Чэмпіёнка XVII, XIX і XX Алімпійскіх гульняў (1960, 1968, 1972), пяціразовая чэмпіёнка свету, шматразовая чэмпіёнка СССР. Неаднаразовая ўладальніца Кубка Еўропы, Кубка СССР.

У гэты ж дзень нарадзіўся Уладзімір Феліксавіч Багінскі, беларускі вучоны ў галіне лесаводства, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па лесаводстве, лесаўпарадкаванні, лясной таксацыі, лесаднаўленні, эканоміцы і арганізацыі лясной гаспадаркі, экалогіі раслін.

У свеце

1238 год — хан Батый разрабаваў і спаліў Маскву. Лаўрэнцеўскі летапіс, вядомы па спісе 1377 года, так апісаў спусташэнне горада: «Взяша Москву татарове, и воеводу убиша Филипа Нянка за правоверную хрестьянскую веру, а князя Володимера яша руками, сына Юрьева, а люди избиша от старьца и до сущаго младенца; а град и церкви святыя огневи предаша, и манастыри вси и села пожгоша и много именья вземше отъидоша».

1886 год — у ЗША ўпершыню афіцыйна адсвяткавалі Дзень сурка.

1918 год — СНК Савецкай Расіі зацвердзіў дэкрэт «Аб свабодзе сумлення, царкоўных і рэлігійных таварыствах» (аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы).

1943 год — савецкія войскі атрымалі гістарычную перамогу ў Сталінградскай бітве, якая ўнесла вырашальны ўклад у дасягненне карэннага пераломы ў Вялікай Айчыннай вайне.

Так гаварыў...

САКРАТ:

«Жэнішся ты ці не — усё роўна пашкадуеш».

УСМІХНЕМСЯ

— Можа, возьмем што да чаю?

— А ты чаго хацела б?

— Ну не ведаю. Можа, піва возьмем?

— Давай, і скумбрыю вэнджаную.

Выдавец — перакладчыку:

— Прабелы вы не перакладаеце, таму прабелы мы вам аплачваць не будзем.

— Добра, я дашлю вам пераклад без прабелаў.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.672. Індэкс 63850. Зак. № 409.

Нумар падпісаны ў 19.30 1 лютага 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12